Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВАЗДА

№ 280. (3388) Нядзеля 8 сьнежня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, гаўтоўка—781

Радыё ад 8 ранішняга:

ВАРШАВА, 7. У ДЗЕНЬ АДКРЫЦЬЦЯ СОЙМУ—У ЛОДЗІ АДБЫЛАСЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ РАБОЧЫХ, НА ЧАЛЕ ЯКОЙ СТАЯЛІ КАМУНІСТЫЯ. ПАЛІЦЫЯ, РАЗГАНЯЮЧЫ ДЭМАНСТРАНТАЎ, МНОГІХ ЗЬБІЛА. ШМАТ РАБОЧЫХ АРЫШТАВАНА.

Апошнія навіны Б. С. С. Р.

300 тыс. руб. на мэдычнае абслугоўваньне калгасьнікаў

Наркамат Аховы Здароўя ўзбуджае хадайніцтва перад СНК аб водпуску 300 тысяч рублёў на палепшаньне мэдыцынскага абслугоўваньня калгасьнікаў Беларусі. Памячаецца пашырэньне колькасьці бальнічных ложнаў у раёнах масавай калектывізацыі, адкрыцьцё раду новых мэдычных пунктаў і г. д.

СЬНЕЖАНЬ--РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ

Толькі 3 акругі--Бабруйская, Менская і Віцебская--дасягнулі ў першую пяціднёўку належнага тэмпу

Іншыя акругі недапушчальна адстаюць, ганебна пляцецца ў хвасьце Полаччына--важнейшая ільнаводная акруга

Мабілізуем увагу мас да пытаньняў экспартнай работы

Шпаркі тэмп індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскае гаспадаркі высоўваюць рад надзвычайна важных задач у галіне экспарту. Экспарт вызначае разьмеры нашага імпарту машын і абсталяваньня для новых фабрык і заводаў, трактараў для вёскі.

БССР у мінулым годзе дасягнула пэўных посьпехаў у галіне экспарту. Экспартны плян быў выкананы. Узьніклі новыя віды экспарту, узмацніўся вываз за граніцу другарадных відаў тавараў. Аднак, посьпехі гэтыя далёка невыстарчальны і вельмі адстаюць ад нашых запатрабаваньняў у гэтай галіне. У гэтым годзе плян вывазу тавараў за граніцу значна павялічаны. Мы павінны яго ня толькі выканаць поўнасьцю і ў тэрмін, але і перавысіць.

Для гэтага патрэбны зусім іншыя мэтады работы, зусім іншыя яе тэмпы.

Да гэтага часу наша грамадзкасьць параўнаўча мала цікавілася гэтай галінай нашай работы. Масы ня былі мабілізаваны для вырашэньня экспартных задач. Шмат якія мясцовыя арганізацыі лічылі экспартную работу трэцяступеньнёвай, займаліся ёю між іншай справай. **Акруговыя камісіі дапамогі** экспарту не працавалі, фактычна існавалі толькі на паперы.

Між тым, у нас, у БССР для ўзмацненьня экспарту можна зрабіць шмат чаго, ёсьць, можна сказаць, неабмежаваныя магчымасьці. І асабліва ў галіне другараднага экспарту.

Якую ролю ў нашым экспартным балянсе адыгрываюць другарадныя прадукты, можна меркаваць хоць-бы па тым факце, што агульны кошт іх вывазу **значна** перавышае кошт лесу, які экспартуецца з БССР, гэтага галоўнага і аснoўнага артыкулу нашага вывазу за граніцу.

Увесь наш экспартны плян у аснoўным складаецца з вялікай колькасьці **дробных** артыкулаў экспарту, ножны з іх параўнаўча на невялікую суму. Агулам-жа ўсе гэтыя «дробязі» даюць вялізную суму, якая дае магчымасьць увозіць абсталяваньне для прамысловасьці і трактары для сельскай гаспадаркі.

Цэлы рад **відаў другараднага экспарту намі ня выкарыстаны.** Па іншых галінах мы зрабілі вельмі мала ў параўнаньні з магчымасьцямі. **У нас літаральна валяюцца пад нагамі сотні тысяч настолькі каштоўнай для нас замежнай валюты.**

Зусім слаба выкарыстоўваюцца **адкіды,** якіх так многа на кожным дварэ, у кожнай гаспадарцы. Утылізацыя гэтых адкідаў можа даць многае для вывазу за граніцу. Збор адкідаў зараз праводзіцца **горш,** чым да рэвалюцыі. А між тым, патрэбны нязначныя сродкі і невялікія намаганьні, каб арганізаваць гэту справу.

Ягады, грыбы, лекавыя травы, косьці, апучы і г. д. — усё гэта патрэбна для экспарту. Намэнклятура тавараў, здатных для вывазу, вялікая. Яна можа быць значна павялічана пры праяўленьні ініцыятывы нашымі арганізацыямі.

Ясна, што задачу ўзмацненьня другараднага экспарту немагчыма поўнасьцю вырашыць толькі ведамственым, габінэтным шляхам. Мы пасунем гэту справу наперад толькі ў тым выпадку, калі актывізуем работу мясцовых арганізацый, калі прымусім сапраўды працаваць камісіі дапамогі і, галоўнае, калі прыцягнем да непасрэднага і актыўнага ўдзелу ў экспартнай рабоце шырокія масы. **Экспартная кампанія павінна быць вялікай грамадзкай кампаніяй.** Падняць масы, сканцэнтраваць іх увагу на гэтым важным для нас вучастку, дасканала выкарыстаць і заахвочваць ініцыятыву, — над гэтымі задачамі павінны ўпарта працаваць нашы грамадзкія і гаспадарчыя арганізацыі.

Трэба ўсямерна выкарыстаць пастановы ўрадавых органаў аб прэміяваньні звышплянавых загатовак прадуктаў другараднага экспарту дадатковым завозам трактараў. **«Дайце рызьзё, косьці, ягады, — атрымаеце трактары»** — гэты лёзунг павінен быць добра вядомы нашай вёсцы.

Трэба паставіць пад пільны грамадзкі кантроль работу нашых гаспадарчых органаў, якія працуюць на экспарт. Да гэтага часу ёсьць многа спрэчак, грызьні паміж паасобнымі арганізацыямі за права непасрэднага выхаду на заграничны рынак і вельмі мала ўпартай штодзённай работы для ўзмацненьня загатовак для экспарту. Тут вельмі многа зможа зрабіць наш каськ, адкрыўшы агонь па асобных

Кампартыя выступае супроць фашысцкай дыктатуры, супроць сойму, супроць ППС

ПРЭЧ ФАШЫЗМ! НЯХАЙ ЖЫВЕ ПОЛЬСКАЯ САВЕЦКАЯ РЭСПУБЛІКА---

вось лёзунгі, пад якімі кампартыя Польшчы мабілізуе працоўныя масы

Чырвоны сьцяг у сойме

ВАРШАВА, 7. Пасьля ўчарайшых прымірэнчых прамоў прадстаўнікоў «левай» апазыцыі ў часе спрэчак па бюджэце, на якія ўрад ня даў ніякага адказу, так званая левая апазыцыя, у мэтах выратаваньня свайго прэстыжу, пастанавіла ўнесьці вотум недавер'я ўраду Сьвітальскага. Усё сёняшняе пасяджэньне было прысьвечана шырока разгарнуўшымся спрэчкам па прапанове аб выказаньні недавер'я ўраду. З прамовамі выступалі па чарзе амаль усе міністры.

Зьяўленьне міністраў на трыбуне было спаткана дэманстрацыяй з боку рабоча - сялянскага блёку. Пры зьяўленьні Сьвітальскага раздаліся крыкі: «прэч дыктатуру фашызму, няхай жыве дыктатура пралетарыяту». За гэты лёзунг камдэпутат Росяк заклікаецца Дашынскім да парадку. Складкоўскага спатыкаюць воклічам: «Кат, забойца Вернага» (рабочы, забіты напярэдадні 12-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі). З боку ўраду і ўрадавага блёку ясна адчуваецца жаданьне зацягнуць спрэчкі і не дапусьціць сёньня галасаваньня вотуму недавер'я.

За вотум недавер'я ўраду ў сойме было падана 246 галасоў, супроць — 120. Рабоча - сялянскі блёк ня прымаў удзелу ў галасаваньні. Камфракцыя арганізавала дэманстрацыю ў залі пасяджэньня. Раздаваліся воклічы: «Прэч фашызм!», «Няхай жыве Польская Савецкая рэспубліка». Камдэпутаты запяялі Інтэрнацыянал. Камдэпутат Росяк разгарнуў чырвоны сьцяг. Старшыня сойму Дашынскі закрыў пасяджэньне.

У суботу пасяджэньне сойму будзе працягвацца далей.

П. Валошын абвяргае хлусьню польскага агенцтва

ВАРШАВА, 3. Беларуская рабоча-сялянская фракцыя паведамляе, што дэпутат Дварчанін атрымаў з турмы ліст ад дэпутата Беларускай Грамады Паўла Валошына, які зьяўляецца адказам на паведамленьне польскага агенцтва, быццам дэпутаты Беларускай Грамады Валошын, Рак-Міхайлоўскі і Мятла адмовіліся ад Тарашкевіча і намераны прасіць польскі ўрад аб памілаваньні. Дэпутат Валошын, які адбывае катаржнае зьняволеньне, заяўляе:

— Паведамленьне польскага агенцтва — хлусьня. Ніколі я ня меў намеру прасіць аб памілаваньні. Заяўляю, што ніякія меры ня могуць прымусіць мяне зысьці са шляху, па якім я ішоў да гэтага часу. Хлусьнёю зьяўляецца таксама і другое паведамленьне, быццам сярод дэпутатаў Грамады, якія адбываюць зараз катаргу, здарыліся сур'ёзныя непаразуменьні. З Тарашкевічам і іншымі дэпутатамі я ніколі ня бачыўся пачынаючы ад сканчэньня судовага працэсу, бо ўсе мы раскіданы па розных турмах. Катэгарычна салідарызуюся з Тарашкевічам і адкідаю паслугі розных «прыяцеляў», якія клапоцяцца аб нашым звароце да ўраду.

Узмоцненая фашызацыя вайсковых арганізацый

Як падае «Кур. Віл.», (№ 263) «Таварыства вайсковай арганізацыі ў Вільні» з 1930 году пачынае выдаваць сэрыю кніжак, пад назваю «Шляхам прадзедаў». Выданьне гэтае ставіць сабе мэтаю высьвятляць вайсковыя перажываньні палякаў за час ад «вялікай вайны ў арміях», а гэта значыць—кніжкі будуць мець «ура-патрыятычны характар».

Працы гэтага выдавецтва, бязумоўна, будуць накіраваны на прышчапленьне сваім чытачом ідэй «вялікай Польшчы» —«Польшчы ад можа да можа», на прапаганду фашысцкіх ідэй і вайны супроць СССР, як краю, які стаіць перашкодаю ў зьдзяйсьненьні мар польскага фашызму аб стварэньні «вялікай Польшчы»; як краю, які стаіць на абароне прыгнечаных і да якога зьвернута ўвага працоўных усяго сьвету, у тым ліку і працоўных Польшчы.

З мэтаю падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР—польскія фашыстыя праводзяць зараз узмоцненым тэмпам фашызацыю як дзяржаўных устаноў так і розных арганізацый, асабліва вайсковых. У апошні час, бадай, ва ўсіх ўрадавых установах, у тым ліку і на чыгунцы, адказныя пасады замяняюцца вайсковымі, праводзіцца цэлы шэраг зьездаў і інспэкцый розных вайсковых арганізацый. Гэтыя мерапрыемствы праводзяцца з мэтаю «ачышчэньня» і насаджэньня ва ўсіх галінах жыцьця сучаснае Польшчы надзейных прыхільнікаў фашызму, каб мець «цьвёрдую руку» на выпадак вайны з СССР.

Арганізацыя ў Вільні „Навуковага Інстытуту Усходняе Эўропы"

Як падае «Кур. Віл.», у Вільні арганізоўваецца «Навуковы Інстытут Усходняе Эўропы». Мэты яго наступныя:

«а) досьлед зямлі і насельніцтва паміж Бальтыцкім і Чорным морам у пытаньнях: гістарычным, геаграфічным, гаспадарчым, культурным і палітычным;

б) арганізаванае сыстэматычнае вывучэньне гэтых пытаньняў у мэтах пашырэньня ведаў у гэтай галіне, як сярод палякаў, так і сярод іншых нацыянальнасьцяй, якія насяляюць названыя землі.

Інстытут мае прыступіць да апрацаваньня паасобных пытаньняў у адназначных галінах, адчыніць бібліятэку, склікаць зьезды вучоных і грамадзкіх дзеячоў, а таксама праводзіць сыстэматычныя даклады і папулярныя лекцыі».

На чале гэтага «навуковага інстытуту стаяць вядомыя пілсудчыкі: сэнатар Абрамовіч, былы ваярода Дунін-Баркоўскі, вядомы сваёю агрэсыўнасьцю ў адносінах да СССР, начальнік Усходняга адзелу міністэрства замежных спраў—Галуўка і інш.

З паданага яскравых відны заданьні гэтага «інстытуту». Усход Эўропы, паводле статуту—**гэта тэрыторыя Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны.** І вось на гэтых тэрыторыях польскі фашызм імкнецца «пашырыць веды». Што гэта за «веды» і сярод якіх пластоў насельніцтва польскі фашызм імкнецца пашыраць іх—нам надта добра вядома.

Рада Манчжурыі ўхваліла савецка-мукдэнскі пратакол

Абмен тэлеграмамі паміж Чжан Сюэ-лянам і НК замежных спраў

МАСКВА, 6. 5-га сьнежня гэтага году НК Замежных спраў атрымаў з Мукдэна тэлеграму, у якой Чжан Сюэ-лян паведамляе, што ён паслаў дыплёматычнага камісара Цай Юнь-шэна з афіцыйнымі пісьмовымі поўнамоцтвамі для абгаварэньня ўсіх пытаньняў з прадстаўніком СССР Сіманоўскім, згодна нашай тэлеграфнай перапісці і вынікаў нарады 6-га сьнежня г. г.

НКЗС паслаў старшыні Мукдэнскага ўраду маршалу Чжан Сюэ-ляну адказ, у якім паведамляецца, што агенту НКЗС грамадзяніну Сіманоўскаму даны ўказаньні спаткацца з панам Цаем.

ШАНХАЙ, 7. Мукдэнскі карэспандэнт газэты «Норд Чайна Дэйлі Ньюс» піша, што пасьля доўгай нарады палітычнай рады Манчжурыі, на якой быў ухвалены савецка-мукдэнскі пратакол, Цаю даручана весьці далейшыя перагаворы з СССР. Сун Чун-хуан згодна савецка-мукдэнскаму пратаколу падаўся ў адстаўку. Паведамляюць таксама, што ў адстаўку вышаў і Чан Чын-гуй. Мяркуюць, што дубанем дарогі будзе назначаны Лю Шан-чын.

Далёка-Усходняя павінна быць напагатове

ПАРЫЖ, 6. Зазначаючы на паведамленьні з Шанхая аб тым, што Нанкін не прызнае Мукдэнска-савецкае згоды, «Юманітэ» бачыць у гэтым просты вынік выступленьня імпэрыялісцкіх дзяржаў. «Юманітэ» прыходзіць да вываду, што як савецкай дыплёматы, так і войскам Далёка-Ўсходняй Арміі трэба быць напагатове.

****

Даклад тав. Галадзеда аб гаспадарчым становішчы БССР на беларускім вечары ў Маскве

МАСКВА, 7. (Па тэл. ад наш. кар.). У сувязі з прабываньнем у Маскве на сэсіі ЦВК СССР членаў ураду БССР, Беларускае студэнцкае зямляцтва сумесна з беларускім клюбам наладзілі ўчора ў памяшканьні Унівэрсытэту нацменшасьцяй Захаду імя Мархлеўскага вечар, на якім старшыня СНК БССР тав. Галадзед зрабіў вялікі даклад аб гаспадарчым становішчы Савецкай Беларусі, пасьля чаго адбыўся канцэрт.

Зводка з фронту загатовак ільну

На 6-е сьнежня месячны плян загатовак ільну па БССР выкананы ўсяго толькі на 14,3 проц., а гадавы плян выкананы на 26,4 проц.

На першым месцы па выкананьні месячнага пляну загатовак ільну ідзе Бабруйская акруга, якая выканала 41,7 проц. Наглядаецца пералом у загатоўках у Менскай акрузе, якая выканала 18,9 проц. месячнага пляну, і Віцебская — 17,3 проц. Адстаюць Магілеўская акруга — 15,1 проц., Аршанская — 14,9 проц., Гомельская —10,9 проц. месячнага пляну. Зусім дрэнна абстаіць справа з выкананьнем пляну загатовак ільну ў Полацкай акрузе, якая выканала ўсяго 4 проц. месячнага пляну.

Толькі тры акругі — Бабруйская, Менская і Віцебская — пры далейшым разьвіцьці ўзятых тэмпаў у наступных пяціднёўках змогуць выканаць сьнежаньскі плян загатовак ільну.

Сучасны тэмп загатовак у іншых акругах не гарантуе выкананьне месячнага заданьня, не гаворачы ўжо аб кампэнсацыі недахвату загатовак мінулых месяцаў.

Недапушчальна адстае Полацкая акруга, якая зьяўляецца аднэй з ільнаводных акруг. Полацкія арганізацыі павінны памятаць, што Полацкая акруга зьяўляецца аднэй з рашаючых ільнаводных акруг, і павінны ўзяцца за работу пабаявому, каб дабіцца ўзмацненьня тэмпу загатовак ільну.

Першая пяціднёўка паступленьня загатовак ільну паказвае, што месцы яшчэ не дабіліся рашучага пералому.

Усе партыйныя і савецкія арганізацыі павінны прыняць усе захады, каб наступная пяціднёўка дала ўжо лепшыя вынікі загатовак ільну па ўсіх акругах.

Сьнежань зьяўляецца рашаючым месяцам у загатоўках ільну. Месцы павінны памятаць і прыкласьці ўсе сілы, каб выканаць поўнасьцю плян загатовак у сьнежні месяцы і недахват загатовак за мінулыя месяцы.

Больш увагі якасьці ільну

На 1-е сьнежня сыстэмай спажывецкай кааперацыі гадавое заданьне па загатоўцы ільну-валакна выканана толькі на 20 проц.

Асабліва слаба праходзіць загатоўка па лініі спажывецкай кааперацыі ў Менскай, Бабруйскай, Гомельскай і Магілеўскай акругах. Праўленьне Белкаапсаюзу запрапанавала паказаным арганізацыям неадкладна прыняць рашучыя меры для забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну загатовак ільну. Пастаноўлена камандыраваць групу адказных работнікаў на месцы для праверкі ходу загатовак ільну-валакна.

Зараз у Менск прыехаў загадчык сырцом аддзелам Цэнтрасаюзу, які абсьледваў, як праходзіць загатоўка ільну па лініі спажывецкай кааперацыі.

Трэба адзначыць, што спажывецкая кааперацыя да апошняга часу адносілася недаволі ўважліва да загатовак сырцу. Ня было ніякай плянавасьці ў рабоце і таксама адсутнічаў добра падрыхтаваны і кваліфікаваны штат загатоўчых работнікаў.

У некаторых акругах дрэнна адносяцца да сыстэмы спажывецкай кааперацыі, як да загатоўчыка. Так, у Полацкай акрузе, якая зьяўляецца адным з ільнаводных раёнаў, спажывецкая кааперацыя зусім не дапушчана да загатовак.

На мясцох мала зварачаецца ўвагі на якасьць ільну, які здаецца. У некаторых мясцох адноўкава прэміююцца здатчыкі дрэннага і добрага ільну. Дзяржгандальбел у квітках, якія выдаюцца здатчыку для прэміяваньня прамтаварамі, зусім не паказвае якасьці зданага ільну. Трэба адзначыць, што да гэтага часу яшчэ наогул няма плянавасьці ў разьмеркаваньні прамтавараў і забесьпячэньні імі здатчыкаў ільну.

Да апошняга часу грамадзкасьць слаба была прыцягнута да справы ўзмацненьня тэмпу загатовак ільну.

Рабочая брыгада ў ільнаводныя раёны

Наркамгандлю БССР накіравана ў ільнаводныя раёны рабочая брыгада для ўзмацненьня тэмпу паступленьня загатовак ільну. У склад брыгады ўваходзяць два адказных працаўнікі—вылучэнцы Наркамгандлю і два рабочых фабрыкі «Акцябр», якія шэфствуюць над Наркамгандлю.

Учора адбылася парада Наркамгандлю з рабочай брыгадай, якой даны дасканалыя інструкцыі аб рабоце.

УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД УДАРНЫХ БРЫГАД

Шырэй разгарнуць працоўны энтузіязм і творчую ініцыятыву мас

Вышэй сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва

Рапарт атрадаў савецкай прамысловасьці

МАСКВА, 6. Ранішняе пасяджэньне першага ўсесаюзнага зьезду ўдарных брыгад. З трыбуны зьезду рапартуюць атрады савецкай прамысловасьці. **Вось прадстаўнік Донбасу тав. Ціхонкаў.** Ён кажа: «вуглякопы, інжынэры і тэхнікі заяўляюць зьезду ўдарных брыгад аб тым, што руднікі і шахты Донбасу пераходзяць на баявы тэмп работы. Выканаць пяцігодку ў 4 гады — вось баявы лёзунг вуглякопаў Донбасу і Крывароржжа».

Урал. 150 тысяч рабочых. Ад імя гэтай вялізарнай армії працы зьезду рапартуе тав. **Рабаў.** На Урале 917 ударных брыгад. 107 проц. выкананьне вытворчай праграмы і 25 проц. павялічэньне прадукцыйнасьці працы — вось дасягненьні Златаустаўскага мэталёвага заводу. 111 з палов. проц. выплаўкі чыгуну і эканомія ў 150 тысяч рублёў —вось дасягненьні ўдарнага цэху Ніжня-Тагільскага заводу. Рад заводаў Уралу пераходзіць на баявыя тэмпы работы.

Ад імя рабочых тэкстыльнай фабрыкі «Пролетарская Дыктатура» ў **Арэхава - Зуеве** рапартуе тав. **Сомаў.** Ён заяўляе: 420 тысяч рублёў эканоміі ад рабочых прапаноў. Выпрацоўка вышэй праграмы на кожнага рабочага на 23 проц. Сабекошт ніжэй прамфінпляну на 7 проц.

На трыбуне тав. **Салаўёў.** Ён рапартуе зьезду ад **імя рабочых Ленінградзкага заводу «Электросила». Рабочае вынаходніцтва дало ў гэтым годзе заводу 176 тысяч рублёў эканоміі.** Завод абавязаўся пяцігадовы плян будаўніцтва турбагенэратараў — выканаць у 4 гады. На заводзе створаны з ударныя цэхі. Рабочыя абавязаліся выканаць пяцігодку па маторабудаўніцтве ў 3 гады і даць у 1930-31 годзе 200 тысяч матораў.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ТАВ. ВЭЙНБЭРГА

Але вось на трыбуне зьяўляецца тав. **Вэйнбэрг.** Ён выступіў з дакладам аб задачах сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарных брыгад. Тав. Вэйнбэрг гаворыць: сацыялістычнае спаборніцтва зараз уступае ў III-ці этап свайго разьвіцьця. Зараз высоўваецца новы лёзунг: «ад ударных брыгад да ўдарных цэхаў і прадпрыемстваў».

Далей тав. Вэйнбэрг гаворыць аб паляпшэньні абстаноўкі работы ўдарных брыгад. Стыхійнае ўзьнікненьне сацыялістычнага спаборніцтва, пазбаўленае ў першыя часы ўсялякага кіраўніцтва, прывяло да таго, што на некаторых прадпрыемствах наглядаўся распад ударных брыгад. Вопыт паказаў, што брыгады, якія мелі неабходнае падтрыманьне, наадварот, растуць і мацнеюць. Трэба забясьпечыць максымальнае кіраўніцтва і павялічыць работу ўдарных брыгад з боку гаспадарчых, прафсаюзных і партыйных арганізацый. Нядаўняя праверка ходу сацыялістычнага спаборніцтва выявіла рад фактаў, якія перашкаджаюць рабоце ўдарных брыгад. Гаспадарнікі часамі ня ідуць на дапамогу ўдарным брыгадам, а некаторыя ўдарныя брыгады гоняцца за колькасьцю, не зварачаючы ніякай увагі на якасьць работы. Гэта прыводзіць да павышэньня проценту браку і пагоршаньня выпрацоўкі.

У заключэньне тав. Вэйнбэрг затрымліваецца ўвагу зьезду на новых формах працы — арганізацыі ўдарных калектываў і ўдарных камун. Такія калектывы - камуны маюць вялізарнае будучае. У сучасны момант гэтыя новыя формы камуністычнае працы яшчэ недастаткова шырока ўжываюцца на прадпрыемствах, але вопыт іх работы трэба будзе дэтальна вывучыць, з тым, каб гэтыя новыя формы працы ўжываць у нашай прамысловасьці.

ДАКЛАД ТАВ. СЭГАЛЯ

Ад імя ЦК УсеЛКСМ слова для дакладу даецца тав. **Сэгалю.** Тав. Сэгаль, характарызуючы значэньне сацыялістычнага спаборніцтва ў руху ўдарных брыгад, прыводзіць рад прыкладаў узорнай работы камсамольскіх ударнікаў.

Спыняючыся на цяжкасьцях у сацспаборніцтве і на дасягненьнях ударных брыгад, дакладчык кажа, што спаборніцтва захапіла толькі перадавыя кадры рабочых. Асноўныя рабочыя масы, галоўным чынам новыя кадры, у спаборніцтва яшчэ не ўцягнуты. Недастатковы таксама ўдзел камсамольцаў. На другім годзе пяцігодкі спаборніцтва павінна дабіцца наступных канкрэтных задач: у дагаварох дакладна адзначаць паказьнікі, стварыўшы для рабочых, якія вядуць спаборніцтва, абстаноўку грамадзкага падтрыманьня, забясьпечыць спаборнікаў і ударнікаў ад наступленьня клясавых ворагаў, узмаціць на прадпрыемствах рацыяналізатарскую работу, павысіць тэхнічную пісьменнасьць.

У заключэньне тав. Сэгаль рэкамэндуе ўсямерна практыкаваць вопыт шэфства перадавых прадпрыемстваў над адсталымі фабрыкамі і заводамі.

РАБОЧЫЯ „КРАСНОГО ПУТИЛОВЦА" РАПАРТУЮЦЬ

На вячэрнім пасяджэньні зьезду ўдарных брыгад з прывітаньнямі выступіў тав. **Кео ад імя 14 тысяч рабочых, служачых і інжынэраў «Красного Путиловца».** Зьезд вітае т. Кео.

— «Красный Путиловец», — пачаў тав. Кео, — дасьць савецкай краіне **ў бягучым годзе 10 тыс. трактараў, 90 тыс. тон мэталю, 45 паравозаў і 217 новых трамвайных вагонаў.** «Красный Путиловец» заключыў зараз новы дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з Каломенскім і Краматорскім заводамі, з заводам «Свободный Сокол» і сялянамі Расашанскае акругі. Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал «Красного Путиловца» выклікае ўвесь інжынэрна - тэхнічны пэрсанал Савецкага Саюзу на ўдарную работу, на дапамогу ударным брыгадам рабочых, якія імкнуцца падняць прадукцыйнасьць працы і перагнаць капіталістычныя краіны.

Далей зьезд заслухаў рапарт чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў падшэфнай УсеЦСПС кавалерыйскай брыгады імя тав. Сталіна.

Прывітаньне ад зьезду ўдарных брыгад ЦК УсеКП(б)

МАСКВА, 6. Усесаюзны зьезд ударных брыгад пасылае палкае прывітаньне стойкаму барацьбіту і кіраўніку сацыялістычным будаўніцтвам — Ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б).

Зьезд рашуча пратэстуе супроць нагляе і правакацыйнае ўмяшальнасьці імпэрыялістых у справы СССР, які змагаецца супроць бандыцкага налёту кітайскіх наймітаў. Зьезд ударнікаў заклікае ўсю рабочую клясу і працоўных сялян згуртавацца вакол камуністычнай партыі і з яшчэ большым энтузіязмам, напорам і настойлівасьцю паведзьці наперад справу будаўніцтва сацыялізму.

Вышэй сьцяг Леніна!

Вышэй сьцяг барацьбы за новую сацыялістычную дысцыпліну працы!

На ўсесаюзным зьезьдзе ўдарных брыгад

МАСКВА, 7. (Па тэл. ад нашага кар.). Сёньня заканчваюцца спрэчкі па дакладах т. т. **Біндзрга і Лежавы** аб выніках і пэрспэктывах сац. будаўніцтва.

Заўтра пачынаецца праца сэкцый.

Сёньня вышаў першы нумар спэцыяльнае газэты зьезду **«Первый ударный».** У нумары артыкулы і заметкі, галоўным чынам, саміх ударнікаў.

Група вучоных інжынэраў, прафэсароў і інжынэраў, **якая ставіць сваёй задачай арганізаваць тэхнічную кансультацыю па ўзьняцьці кваліфікацыі рабочых, і ў першую чаргу ўдарнікаў.**

Дэлегацыя БССР на зьезьдзе складаецца з 18 чалавек, у тым ліку 4 батракі. У рапарце зьезду ўдарнікі — рабочыя беларускіх саўгасаў паведамляюць аб вялікіх дасягненьнях саўгасаў Беларусі, дзякуючы сац. спаборніцтву.

Аб настроі, пануючым на зьезьдзе, рабочыя з 30-гадовым вытворчым стажам, зьвярнуліся ў рэдакцыю «Правда» з лістом, у якім заяўляюць аб сваім рашэньні ўступіць у рады кампартыі, і заклікаюць усіх лепшых рабочых з вытворчасьці — піянэраў, сацспаборніцтва пасьледаваць іх прыкладу.

Група дэлегатаў зьезду стварыла спэцыяльную брыгаду, якая зрабіла сёньня налёт на ВСНГ з мэтаю праверыць якасьць кіраўніцтва сацспа-

У БССР арганізуюцца буйныя саўгасы на плошчы 250 тысяч гэктараў

«Зернятрэст» парашыў арганізаваць у БССР некалькі буйных збожжавых гаспадарак на плошчы 250 тысяч гэктараў.

Да арганізацыі гэтых гаспадарак прыступяць з надыходзячай вясны. У бліжэйшыя дні ў БССР прыяжджае спэцыяльная экспэдыцыя «Зернятрэсту» для выбару месца пад збожжавыя гаспадаркі.

Акцыянэрнае таварыства «Скотовод», улічыўшы магчымасьці Беларусі ў галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі, стан шляхоў зносін, блізкасьць раду раёнаў да рабочых цэнтраў у БССР і пэрспэктывы экспарту, парашыў арганізаваць на тэрыторыі Савецкай Беларусі 2-3 жывёлагадоўчыя гаспадаркі на 50 тысяч галоў жывёлы.

Масывы для гэтых жывёлагадоўчых гаспадарак будуць выдзелены на блізкай адлегласьці ад збожжавых гаспадарак «Зернятрэсту», каб жывёлагадоўчыя гаспадаркі маглі скары стоўваць адкіды прадуктаў гаспадарак «Зернятрэсту». Акрамя таго, «Скотовод» будзе імкнуцца будаваць гэтыя гаспадаркі ў тых раёнах, дзе ёсьць бровары, каб скарыстоўваць таксама і іх адкіды.

НАНКІНСКІ ЎРАД НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕНЬНЯ

Паўстаньне 30-ці тысяч войск супроць Нанкіна

ШАНХАЙ, 6. Паўстаньне 30-ці тысяч войска Шы Ю-сяна зьяўляецца значна больш сур'ёзнай падзеяй, чымся гэта здавалася спачатку. Паўстаньне ахапляе ўсё новыя часьці нанкінскага войска. Чан Кай-шы высылае на новы фронт самае лепшае войска, якое да гэтага часу трымалася ў рэзэрве і павінна было быць выкарыстаным у самым крайнім выпадку. Па думцы агенцтва «Рэйтэр», гэтае накіраваньне войска сьведчыць, што ўрад лічыць становішча пагражаючым. У Нанкіне вялікі непакой. Кітайская часьць гораду Шанхая абвешчана на ваенным становішчы.

Паўстаўшае войска захапіла ўвесь рухавы склад у Пукоу (канцовы чыгуначны пункт Цянцьзін-Пукоўскай чыгункі), падпаліла чыгуначныя склады, дзякуючы чаму ўрадавае войска ня мела магчымасьці прасьледаваць паўстаўшых.

ДЭКЛЯРАЦЫЯ ШЫ Ю-СЯНА

ШАНХАЙ, 6 Выступіўшы супроць Нанкіна Шы Ю-сян апублікаваў дэкларацыю, у якой заяўляе, што ён як «глыбока расчараваны нанкінскай палітыкай», лічыць сваім абавязкам трымаць войска нагатове супроць Нанкіна. Шы Ю-сян зьвярнуўся да генэралаў Фынь Юй-сян прапануе гэтым генэралам празваць Ван Цін-вэя, каб прывесьці да парадку палітычныя справы. Горад Анцін (сталіца правінцыі Аньхуэй) заняты войскамі Фынь Юй-сяна. Нанкін выслаў на новы фронт сваё лепшае войска і сваіх нямецкіх ваенных дарадцаў, але не адважваецца перайсьці ў наступленьне, абмяжоўваючы свае задачы аховай тылу і абаронай ракі.

Паведамляюць, што нядаўна паўстаўшае ў Хубэі і Хэнані войска мела сутычкі з урадавымі войскамі каля Ічана. Два ангельскія «истребители» былі абстрэляны паўстаўшымі войскамі. З Ханькоу ў Ічан высланы трэці «истребітэль».

ЕН СІ-ШАН ВЫСТУПАЕ СУПРОЦЬ ЧАН КАЙ-ШЫ?

ШАНХАЙ, 6. Па думцы блізкіх да нанкінскага ўраду колаў, становішча нанкінскага ўраду лічыцца вельмі цяжкім. Для нанкінскага ўраду насталі рашучыя і, быць можа, апошнія дні. Напружанае становішча, якое стварылася ў выніку паўстаньня Шы Ю-сяна, і якое паставіла сталіцу пад непасрэдны ўдар Фынь Юй-сянаўскіх войск тым больш небясьпечна для Нанкіна, што апошні зусім ня ведае на каго ён можа цяпер абаперціся і каго лічыць «лёяльным».

Распаўсюджаньне з Пэйпіну нецэнзураваных тэлеграм Фынь Юй-сяна тлумачаюць на пазыцыю ворагаў Нанкіна.

У Шанхаі ў банкаўскіх і фінансавых колах трывога. Ваенны стан пашыраны цяпер таксама і на прыгарад Вузун, акрамя таго, на чыгунцы Шанхай—Нанкін і Шанхай—Ханьчжоў. Гэтыя чыгункі ўзмоцнена ахоўваюцца войскам.

ВАЕННЫ СТАН У КАНТОНЕ

ЛЁНДАН, 5. Паводле паведамленьня Кантонскага карэспандэнта «Тай» паміж кантонскімі войскамі і часьцямі арміі Чан Фа-гуя адбываюцца сур'ёзныя баі. Баі працягваюцца ў ваколіцах Самшуя (у 40 кілёмэтрах на захад ад Кантона, шлях да заняцьця Кантона). Па словах карэспандэнта, у Кантоне стварылася трывожнае становішча. У горадзе абвешчаны ваенны стан.

НЯЎДАЧА ЧАН КАЙ-ШЫ

ТОКІЁ, 7. Як падае агенцтва Сін Бун-рэнга, перагаворы паміж Чан Кай-шы і Ван Цьзін-вэем спынены з прычыны няпрымірымай пазыцыі апошняга.

ЧУТКІ АБ АДСТАЎЦЫ ЧАН КАЙ-ШЫ

ТОКІЁ, 7. Агенцтва Дэмпа Цусін падае, што 6-га сьнежня на пасяджэньні дзяржаўнае рады Чан Кай-шы заявіў, што ён выходзіць у адстаўку і рэкамандуе ў якасьці кандыдатаў на пост галоўнакамандуючага Ен Сі-шана, а на пост кіраўніка ўраду Тан Ен-кая. Акра-

Аб выніках лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б)*)

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) грунтоўна праверыў аналіз нашай эканамічнай і палітычнай абстаноўкі, які быў даны папярэднім красавіцкім пленумам і XVI-й партканферэнцыяй, з аднаго боку, і супроцьпастаўленую яму ў свой час на тым-жа красавіцкім пленуме пляцформу правых ухілістых—з другога.

Зараз не бясьцікаўна прыпомніць галоўныя пункты гэтай апошняй пляцформы. Што сьцьвярджалі правыя ўхілістыя на красавіцкім пленуме і што падносілі яны партыі незадоўга перад ім у якасьці «политического завещания Ленина»? Яны сьцьвярджалі, што партыя скочваецца да трацкізму і вядзе антысерадняцкую палітыку. Асабліва рэзкія пярэчаньні з боку правых выклікалі мерапрыемствы грамадзка-прымусовага ўзьдзеяньня на кулака. **Правыя з разьвязнай самаўпэўненасьцю «прарочылі», што палітыка партыі нямінуча прывядзе да зрыву ўсіх плянаў прамысловага будаўніцтва і будзе ўсёй мацней абвастраць хлебны крызіс і харчовыя труднасьці ў краіне.** Як выйсьце са становішча правыя прапаноўвалі—адмовіцца ад мерапрыемстваў грамадзка-прымусовага ўзьдзеяньня на кулака, г. зн. фактычна ад наступленьня на кулака, увесьці нармалізацыю рыначных адносін, т. зн. фактычна не перашкаджаць кулаку і прыватніку спэкуляваць хлебам і іншымі дэфіцытнымі таварамі, а хлеб, якога не хапае, замест таго, каб браць яго ад кулака, прывозіць з-за граніцы, само сабой зразумела, за кошт скарачэньня прывозу прамысловага абсталяваньня. Пяцігодку правыя прынялі на словах, на справе-ж прапанавалі замяніць яе **двухгодкай**, пабудаванай на асноўнай ідэі ўзьяўленьня індывідуальнай гаспадаркі ўсяго сялянства ў тым ліку і куляцтва) пры паўнейшым фактычным ігнараваньні задачы ўграмаджаньня сельскай гаспадаркі; яны лічылі, што калгаснае і саўгаснае будаўніцтва здолее разгарнуцца сур'ёзна толькі пасьля доўгага раду гадоў. Такі быў «шлях ратунку», прапанаваны партыі правымі і катэгарычна ёю адкінуты. Прайшло ўсяго паўгода... «І что осталось от гордых, сильных сих мужей», што засталося ад шырокавяшчальных праноцтваў? Дзе нашы сарваныя і ўрэзаныя плыны? Дзе ўзрастаючы хлебны крызіс? Які нармальны чалавек адважыцца цяпер сьцьвярджаць, што саўгасы і калгасы ў нашай краіне здолеюць даць вынікі толькі праз 5-10 год. Гісторыя палітычнай барацьбы, у тым ліку і барацьбы ўнутры нашай партыі ведае наўдачы, паражэньні, але наўрад ці ў ёй знойдзецца шмат прыкладаў такога хуткага і беспаваротнага правалу, які атрымала наша правая апазыцыя, за якіх-небудзь паўгода... У гэтых адносінах яна выперадзіла, бадай, нават трацкізм.

Кантрольныя лічбы, прынятыя пленумам на 1929-30 год, прадугледжваюць рост прамысловай прадукцыі ў два разы ў адносінах да даваеннага ўзроўню, які яшчэ ня так даўно быў для нас чымсьці накшталт ідэалу. Каб мець выразнае ўяўленьне аб тым, якім надзвычайна шпаркім тэмпам мы ідзем наперад, досыць прыпомніць, што 9 год таму назад, у 1920 годзе, мы мелі каля 20 проц. даваеннай прадукцыі, што ні адна краіна ў сьвеце не перажыла такога страшэннага разбурэньня ад імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны, як наша. З таго часу, з 1920 году да 1930, мы павялічваем, такім чынам, разьмеры сваёй прамысловай прадукцыі роўна ў 10 раз.

Але нават, калі ўзяць для параўнаньня з цяперашнім даваенны пэрыяд (ня ўлічваючы страшэнных разбурэньняў вайны і інтэрвэнцыі), то нават у гэтым выпадку мы бачым, што за 15 г. (з 1914 г.) тэмп нашага разьвіцьця (рост на 100 проц.) далёка выперадзіў усе капіталістычныя краіны, да Амэрыкі ўключна. Намячэньні пяцігадовага пляну выперажаны па ўсіх галінах цяжкой індустрыі (па электрабудаўніцтве, па апале, па мэталюргіі, машынабудаўніцтве і інш.), апрача хэмічнай. А трэба-ж ведаць, што гэтыя намячэньні былі далёка вышэй першапачатковых чарнавых накідаў, якія фігуравалі ў плянах нашага Дзяржпляну і якія так жорстка крытыкаваліся дальнабачным аўтарам «Заметок Экономиста» за звыш-індустрыялізатарства.

Пасэўная плошча ў гэтым годзе на 4,5 проц. вышэйшая за леташнюю, наперакор няспрыяючаму надвор'ю і масавай гібелі азіміны на Украіне і Паўночным Каўказе, якая патрабавала перасеву; прычым асабліва пасьпяхова прайшла веснавая пасэўная кампанія 1929 году, якая супала з ужываньнем на справе тых самых мерапрыемстваў грамадзка-прымусовага ўзьдзеяньня на кулака, што правыя ўхілістыя зьвязвалі з наўхільным, «паводле іх думкі», правалам пасэўнай кампаніі. Яшчэ нямы ці дакладных вестак пра вынікі асеньняй пасэўнай кампаніі, але зусім ясна, што плошча пад азімай у гэтым годзе значна вышэйшая за леташнюю. І таксама ясна, што выкананьне ў кароткі тэрмін хлебазагатовак стварае самыя спрыяючыя ўмовы для правядзеньня веснавой пасэўнай кампаніі 1930 году. Так абстаіць справа з урачыста абвешчанай правымі дэградацыяй сельскай гаспадаркі.

Сканчэньне да 1-га сьнежня хлебазагатоўчай кампаніі амаль ва ўсіх раёнах ня толькі дало ў рукі Савецкай улады належныя запасы для забесьпячэньня насельніцтва, але і забясьпечыла нам значныя рэзэрвы. Для правых ухілістых балбатня пра разэрвы была толькі аргумантам за зьніжэньне тэмпаў індустрыялізацыі. Партыя выкрыла гэту балбатню, каб пачаць сапраўднае накапленьне рэальных рэзэрваў. Ніхто не адважыцца рабіць параўнаньне паміж тым становішчам, якое мы маем зараз з хлебам у гэтым годзе з леташнім. І нават самы цьвёрдалобы правы ўхілісты не адважыцца цяпер падаць прапанову аб імпарце.

Так жыцьцё разьбіла дашчэнту тэорыі правых ухілістых аб зьніжэньні тэмпу індустрыялізацыі, аб дэградацыі сельскай гаспадаркі, аб надыходзячым хлебным крызісе і інш. Лінія партыі знайшла сабе бліскучае пацьвярджэньне.

Але задачы, вызначаныя пленумам у галіне далейшага сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуюць ад партыі вялізарнейшага напружаньня сіл. Досыць сказаць, што кантрольныя лічбы вызначаюць павялічэньне прамысловай прадукцыі на 32 проц., а для цяжкой прамысловасьці—на 45 проц., зьніжэньне сабекошту—на 11 проц. і павялічэньне рэальнай заработнай платы—на 12 проц. Гэтыя вялізарныя тэмпы патрабуюць ад партыі і рабочых мас зусім выключнай актыўнасьці і энэргіі. Мы да гэтага часу, ня гледзячы на бурныя тэмпы разьвіцьця гаспадаркі, маем рад слабых вучасткаў. Можна спаслацца на хэмічную прамысловасьць, якая адыгрывае вялізарную ролю ня толькі в пункту гледжаньня сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, але і в пункту гледжаньня першачарговых інтарэсаў дзяржаўнай абароны. Яе разьвіцьцё ў патрэбным тэмпе натыкаецца на рад сур'ёзнейшых перашкод зьвязаных, перш за ўсё, з недахватам адпаведных тэхнічных і навуковых сіл. Гэтыя перашкоды павінны быць абавязкова ліквідаваны ў бліжэйшы тэрмін. Мы маем некаторае (хаця і надзвычайна невялікае) адставаньне ад тэмпаў, вызначаных пяцігодкай па цэлым радзе галін лёгкай прамысловасьці, сырэц для якіх даюць тэхнічныя сельска-гаспадарчыя культуры (бавоўна, буракі, лён і г. д.). Гэты факт прымушае партыю безадкладна дабіцца максымальна магчымага росту пасэўнай плошчы пад паказанымі культурамі. Агульная пасэўная плошча ў мінулым гаспадарчым годзе вырасла на 4,5 проц., замест намечаных 7 проц., у выніку няспрыяючых умоў надвор'я і ў выніку сьвядомага скарачэньня пасеваў кулацка-заможнай часткай села. У гэту восень пры агульным росьце пасэўнай плошчы мы маем таксама некаторае недавыкананьне плянаў. Трэба абавязкова перакрыць гэтае недавыкананьне за кошт пашырэньня засева бяднняцка-сераднняцкіх мас увесну. Мы маем напружанае становішча на вучастку жывёлагадоўлі, якое выклікае на рынку недахват мясных і малочных прадуктаў. Таму задача падняцьця жывёлагадоўлі на бліжэйшыя гады набывае для ўсёй партыі вялізарнейшае значэньне Пленум паставіў гэту задачу, перш за ўсё, перад ураграмаджаным сэктарам сельскай гаспадаркі, намеціўшы адначасова неабходнасьць стымуляваньня росту жывёлагадоўлі і па індывідуальным сэктары. Урэшце, што трэба асабліва падкрэсьліць пры вялікіх, хаця і невыстарчальных посьпехах у галіне зьніжэньня сабекошту і падняцьця прадукцыйнасьці працы, дзякуючы росту актыўнасьці пралетарскіх мас, разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва, падняцьцю прадукцыйнасьці працы,—у нас ёсьць на цэлым радзе галін прамысловасьці зьніжэньне якасьці. І тут патрэбна дабіцца рашучага пералому ў лепшы бок.

Нельга прайсьці міма такога надзвычайна важнага факту, як скарачэньне на 10 проц. беспрацоўя, якое вызначан у гэтым годзе, паводле кантрольных лічбаў. Да гэтага часу, ня гледзячы на шпаркі тэмп разьвіцьця прамысловасьці, колькасьць беспрацоўных з кожным годам павялічвалася. Ня прыходзіцца гаварыць, якім козырам зьяўляецца такі факт для ўсіх ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва СССР, асабліва з лягеру II-га Інтэрнацыяналу. Скарачэньне беспрацоўя, якое вызначана ў гэтым годзе, пры агульным росьце пралетарыяту ў краіне (у сувязі з пашырэньнем вытворчасьці, з увядзеньнем бесьпераперынкі) і павялічэньнем рэальнай заработнай платы на 12 проц. зьявіцца буйнейшым посьпехам партыі, якога яна дабіецца, апіраючыся на ўзрастаючую актыўнасьць рабочых мас, ва што-б там ні стала.

(Канец будзе)

*) Гэты артыкул будзе надрукаваны поўнасьцю у № 22 «Большевіка», які выйдзе гэтымі днямі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

БУДЗЕМ УПАРТА І БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З ІДЭАЛЁГІЯЙ І ПРАКТЫКАЙ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ

ЯШЧЭ БОЛЬШ РАЗГОРТВАЮЧЫ БАЛЬШАВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ, ДА КАНЦА ВЫКРЫЕМ АНТЫПАРТЫЙНЫЯ ПОГЛЯДЫ ПРАВЫХ КАПІТУЛЯНТАЎ.—ДАМО РУЙНУЮЧЫ АДПОР ТЫМ, ХТО ІМКНЕЦЦА ЗАТАРМАЗІЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЕ САМАКРЫТЫКІ, ХТО ЗАЦІСКАЕ ЯЕ

РЭЧЫЦКІЯ ПРАВАЛЫ

Калі самакрытыка не зьяўляецца мэтадам работы

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

У папярэдніх артыкулах мы спыняліся на становішчы партарганізацыі на фабрыках **«Дняпро», «Х-ты Кастрычнік»** і фанэрным заводзе **Рэчыцы.**

Якая-ж была агульная абстаноўка ў гэтым аб'яднаным калектыве, якавы яе спэцыфічныя асаблівасьці, якавы былі аб'ектыўныя труднасьці ў рабоце, якіх ня здолела перамагчы партыйная арганізацыя з прычыны буйных палітычных памылак заводзкага і раённага кіраўніцтва.

Склад рабочага калектыву вельмі стракаты. На прадпрыемства за апошні год прынята звыш 1.000 новых рабочых, з якіх каля 500 чалавек зьвязана з вёскай. Мела месца вялікая цякучасьць складу рабочых.

Работа ўскладнілася яшчэ тым, што на заводзе працуюць рабочыя розных нацыянальнасьцяй. Гэта вымагала ад заводзкіх арганізацый зьвярнуць асаблівую ўвагу на інтэрнацыянальнае выхаваньне.

Усе гэтыя аб'ектыўныя труднасьці ня могуць апраўдаць памылак кіраўніцтва, бо тое, што **можна** было зрабіць у гэтых умовах, **далёка ня зроблена.**

Гэтыя труднасьці толькі з большай сілай яшчэ раз падкрэсьліваюць усю нятрунтоўнасьць кіраўніцтва. Іменна гэта абстаноўка рашуча патрабавала выразнай і яснай установкі на асноўныя задачы, якія пастаўлены партыяй, вымагала цьвёрдага ажыцьцяўленьня тых практычных мерапрыемстваў, якія пасаданы ў важнейшых партыйных пастановах у галіне камуністычнага выхаваньня мас, інтэрнацыянальнае работы, уадыму іх творчага энтузіязму, глыбокага разгортваньня самакрытыкі, згуртаваньня пралетарскіх мас вакол лёзунгаў партыі і рашучага наступленьня на клясавага ворага.

Ва ўмовах работы фабрыкі «Дняпро» ўсе гэтыя пытаньні набывалі асабліва актуальнае значэньне, вымагалі ад кіраўніцтва асаблівай выразнасьці, асаблівай напорлівасьці і цьвёрдасьці, здольнасьці аналізаваць працэсы, якія адбываюцца на прадпрыемстве, праверкі і нагляду над выкананьнем гэтых заданьняў.

Што-ж мы бачым на «Дняпры»?

Замест рашучага ачышчэньня прадпрыемства ад клясава-варожых элемэнтаў, якія пашырылі антыпралетарскія настроі і нацыянальную варожасьць—прымірэнчыя «человеколюбивые» адносіны да іх з боку кіраўніцтва. Замест бальшавіцкага разгортваньня самакрытыкі, мабілізацыі найпырэйшых мас рабочых на барацьбу з недахопамі і скажэньнямі ў рабоце—просты **заціск самакрытыкі.**

Возьмем для прыкладу прафэсыянальную работу. У гэтай галіне зьдзіўляе інэртнасьць, кансэрватыўнасьць, бюракратычнасьць кіраўніцтва, павярхоўнасьць, нікчэмнасьць форм усёй масава-палітычнай работы.

Новыя задачы і формы работы, новыя лёзунгі, высунутыя практыкай сацыялістычнага будаўніцтва за апошні час,—яшчэ зусім не дайшлі да прадпрыемства. Цэхавыя прафорганы за поўную бязьдзейнасьць распушчаны. Культкамісія, якая за ўвесь час сабралася толькі адзін раз, зараз таксама распушчана. Бязумоўна, трэба будзе распусьціць і ўвесь склад фабрычнага камітэту.

Вельмі паказальна, што за час сацспаборніцтва працоўная дысцыпліна ўпала, павялічыліся прагулы і брак. Рабочыя ня ведаюць, што зроблена па выкліках іншых прадпрыемстваў на сацыялістычнае спаборніцтва. Ударныя брыгады ў некаторых выпадках зусім не зьяўляюцца паказальнымі.

Вялікія прарывы мелі месца ў галіне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочае масы. Работа ў клюбе зусім занепала. Бязьдзейнічаюць чырвоныя куткі. Здаецца, што на прадпрыемстве, дзе працуе 1.500 жанчын, трэба было-б зьвярнуць асаблівую ўвагу на такую рэч, як дзіцячыя ясьлі. Але і ў ясьлях выяўлены агідніейшыя непарадкі.

Так ажыцьцяўляецца на «Дняпры» новы курс **прафэсыянальнай** работы.

Возьмем цяпер групу пытаньняў **унутрыпартыйнай** работы. Мы ўжо гаварылі аб буйнейшых недахопах кіраўніцтва ў галіне агульных прынцыповых установак у рабоце, у галіне ўзмацненьня ідэалёгічнай устойлівасьці і тварыстчнага ўзроўню членаў і кандыдатаў партыйнай арганізацыі. Акрамя гэтага мае месца таксама і рад выключна арганізацыйных недахопаў. Нізавая цэх'ячэйка адчуваецца ва ўсім жыцьці прадпрыемства вельмі слаба. Партбюро ня ўжыло патрэбных мер па ўзмацненьні цэх'ячэек, па ўзьняцьці іх працаздольнасьці і павышэньні аўтарытэтнасьці. Ва ўсёй сыстэме кіраўніцтва адчуваўся моцны перагіб у бок голага адміністраваньня, націску, а часамі і простай падмены цэхбюро і цэх'ячэек. Зразумела, што з прычыны слабасьці цэхавых парт'ячэек і агульнага становішча на прадпрыемстве, **рост арганізацыі праходзіў зусім невыстарчальна.** За апошнія 6 месяцаў калектыў вырас усяго на 12 чал. **Гэта пры наяўнасьці каля 3.000 рабочых на прадпрыемстве.** Аб якасьці ўнутрывыхаваўчай работы ў калектыве, паводле нашай думкі, яскрава сьведчыць той факт, што з 94 кандыдатаў, 37 чал. маюць кандыдацкі стаж з 1927-28 году. І гэта ва ўмовах вытворчай арганізацыі. Паказальна, што на ўсім прадпрыемстве **«Зьвязда»** выпісваецца ў колькасьці 8 экзэмпляраў, **«Чырвоная Зьмена»**—11 экзэмпляраў, а **«Бальшавік Беларусі»** ня выпісваецца зусім.

Моцна кульгае кіраўніцтва **камсамолам.** За цэлы год на партбюро стаяла толькі адно камсамольскае пытаньне—аб запаўненьні брані. Паўтара дзесятка камсамольцаў выйшлі з ударных брыгад. Сярод асобных камсамольскай наглядаюцца моцныя ідэалёгічныя хістаньні, неразуменьне сутнасьці правага ўхілу і «левых» паскокаў на лінію партыі.

На самой вытворчасьці мы маем такое становішча:

Сабекошт зьніжаны ўсяго на 1 проц., замест 7 проц. Брак павялічыўся катастрафічна. З 3,88 у чэрвені да 4,66 у верасьні. З кожным месяцам павялічваліся прагулы. На **«Х-тым Кастрычніку»** вытворчая праграма выканана толькі на 60 проц. Сабекошт прадукцыі **вырас на 2,08 проц.** Брак вырас з 6,17 проц. у ліпені—да 7,25 у верасьні.

***

Нельга не задаць пытаньне: чаму ўсе гэтыя вялікія недахопы ня сустрэлі своячасовага рэагаваньня, чаму рад агідных зьяў і хваравітых фактаў застаўся незаўважаным да самага апошняга часу? Становішча, што стварылася на прадпрыемстве, магло захавацца на доўгі час толькі таму, што **самакрытыка была груба заціснута,** толькі таму, што заводзкае кіраўніцтва няўважліва ў поўным сэнсе гэтага слова адносілася да заяў і скаргаў, якія паступалі ў свой час.

Партбюро ня толькі не кіравала разгортваньнем самакрытыкі, ня толькі ня імкнулася зрабіць самакрытыку мэтадам пастаяннай работы, а наадварот заціскала самакрытыку, ня выконваючы пастаноў партыі аб усямернай дапамозе і падтрыманьні ініцыятывы і творчай актыўнасьці мас. Сярод кіраўнічай верхавінкі панавала кругавая парука і сямейнасьць. Заявы, якія падаваліся асобнымі камуністымі і рабочымі, валяліся **ў папках цэлымі месяцамі без усялякага руху.** Так, напрыклад, заява рабочых аб шкодніцтве на фабрыцы валялася ў папках больш за 5 месяцаў.

А што азначаюць пасяджэньні на кватэры сакратара парткалектыву бяз поўнага складу бюро? Дзеля чаго яны былі патрэбны. «Актыў» падбіраўся з блізкіх людзей. Вылучэньства праводзілася габінэтным парадкам.

Рабочыя на цэхавых сходах проста заяўляюць, што «мы стаялі зусім у баку ад вылучэньства. Ніхто ня цікавіўся нашай думкай».

Друкаваныя і насьценныя газэты страцілі ўсялякае значэньне, бо ў сыстэме работы практыкаваліся ўсялякага роду «санкцыі», «узгадненьні» і г. д., што прывяло да простага замазваньня недахопаў.

Заметкі аб недахопах і прапановы рабочых заставаліся без адказу, не выклікалі належных мерапрыемстваў з боку партбюро і адміністрацыі.

Шмат заяў аб асобных работніках «згублены», а пытаньне аб іх замазвалася. Рабочыя зараз робяць масавыя заявы аб тым, што імі паведамлялася ўжо раней аб шматлікіх выпадках антыпартыйных паводзін асобных камуністых, аб антысавецкім мінулым асобных работнікаў, але... усё гэта ня прыносіць ніякіх вынікаў. Заціск самакрытыкі з боку кіраўніцтва моцна ўкараніўся ў Рэчыцы. Толькі пры такім становішчы стала магчымым прабываньне на прадпрыемстве агентаў клясавага ворага, частка якіх пралезла нават у рады партыі на кіраўнічую работу, як напрыклад, Столяраў, Лаўрыновіч, Самончык і т. д. Толькі пры такім становішчы клясавы вораг меў магчымасьць бяскарна праводзіць антысавецкую контр-рэвалюцыйную агітацыю распаўсюджваць антыпралетарскія настроі і нацыянальную варожасьць, весьці падрыўную дэзарганізатарскую работу на вытворчасьці.

Партыйнае бюро яшчэ і зараз ня хоча прызнаць, што яно праводзіла сапраўдны заціск самакрытыкі. У сваёй пастанове ад 23-га лістапада (калі ўпяршыню абмяркоўвалася пытаньне аб становішчы самакрытыкі) бюро піша:

«Адзначыць, што ёсьць **паслабленьне** самакрытыкі ў калектыве, а з боку **асобных цэх'ячэек ёсьць моманты** заціску самакрытыкі».

Нельга змазваць пытаньне, шукаць шчыліны для выйсьця, апраўдваць сваю «ўстаноўку» ў галіне самакрытыкі. Схадзеце ўцэхі, паслухайце, што там гаворыць **маса** партыйцаў і беспартыйных рабочых і вы пераканаецеся, што справа ідзе далёка не аб **«паслабленьні» і «асобных момантах».**

***

Раённае партыйнае кіраўніцтва прайшло міма тых хваравітых зьявішч, якія пад бокам райкому мелі месца на прадпрыемстве. А хваравітыя зьявы мелі месца ня толькі ў калектыве фабрыкі «Дняпро». Заціск самакрытыкі, хвасьцізм парткіраўніцтва ў пытаньнях сацыялістычнага спаборніцтва, антысэмітызм, антыпралетарскія настроі былі ў тэй ці іншай ступені на заводзе імя **Томскага,** на заводзе **«Інтэрнацыянал».**

Усе гэтыя баличкі і хваравітыя зьявы выкрыты **паміма раённага кіраўніцтва, праз яго голаву.** Раённы камітэт не кіраваў разгортваньнем самакрытыкі на прадпрыемстве. Ён ні разу не абмяркаваў гэтага пытаньня. А між тым нельга сказаць, што раённы камітэт ня быў зьвязаны з фабрыкай «Дняпро». На пленуме ў красавіку стаяў даклад заводакіраўніцтва, а ў верасьні сакратар райкому праводзіў вытворчую канфэрэнцыю, акрамя таго ў партканклетыве фабрыкі «Дняпро» знаходзяцца тры члены і адзін кандыдат бюро раённага камітэту партыі. Але, ня гледзячы на гэта, сьцяна заціску, створаная глупышцелямі самакрытыкі, не прыцягнула ўвагі раённага камітэту партыі.

Невыпадкова, нам здаецца, што вось пытаньне аб становішчы самакрытыкі раённы камітэт не абмяркоўваў, а выпадкі «прычосваньня» самакрытыкі былі. Камісія, вылучаная РК у парадку падрыхтоўкі да чысткі на заводзе імя Томскага, устанавіла моманты заціску самакрытыкі ў факце няўважных адносін да рабкора. А ў раённым камітэце камісіі «параілі» перарабіць свае вывады так, што, моў, быў ня заціск, а «момант, які мог прывесьці да заціску самакрытыкі». Невыпадкова, што рабкору за зьмяшчэньне заметкі ў «Полесской Правде» ў прысутнасьці двух прадстаўнікоў раённага камітэту была вынесена вымова. У недалёкім мінулым рабкор Смалякоў **за правільную па сутнасьці заметку,** зьмешчаную ў «Полесской Правде», быў адданы пад суд. Праўда, потым суд, зразумела, з-за беспадстаўнасьці абвінавачаньняў, вымушан быў рабкора Смалякова апраўдаць.

Акруговы камітэт улетку правёў абсьледваньне парткалектыву «Дняпро». Быў на фабрыцы «Дняпро» і інструктар АПБ. У верасьні акруговы камітэт заслухаў даклад заводакіраўніцтва «Дняпро». Але і да акруговага кіраўніцтва сапраўднае становішча ў Рэчыцы не дайшло.

***

Рэчыцкія прарывы глыбокія. Але заводзкі калектыў «Дняпро» ў асноўным **здаровы. Рабочыя масы** з энтузіязмам прымаюць удзел у сацыялістычнай будоўлі. Часткова абноўленае кіраўніцтва ўжо многа зрабіла па аздараўленьні парткалектыву. Спэцыяльная камісія АКК зрабіла вялікую работу па выкрыцьці асобных хваравітых зьяў. Па многіх з іх ужо ўжыты рашучыя меры. Частка асоб, якія прымазаліся да партыі, з цёмным мінулым, ужо выкінута з партыі. Распушчана цэхбюро стругальнага цэху. Зроблены рад іншых арганізацыйных вывадаў. Чысткі, што пачынаецца гэтымі днямі, бязумоўна канчаткова аздаровіць калектыў. Зараз трэба паставіць пытаньне аб стварэньні заводзкага партыйнага камітэту, які-б аб'яднаў кіраўніцтва трыма буйнейшымі вытворчымі арганізацыямі («Дняпро», «Інтэрнацыянал», завод імя Томскага).

Тая актыўнасьць, той размах самакрытыкі, якія зараз разгарнуліся на прадпрыемстве, тое імкненьне ачысьціцца ад чужых элемэнтаў, нарэшце, наяўнасьць надзейнага пралетарскага ядра, наяўнасьць поўнага і цьвёрдага імкненьня да ўпартай перамогі над усімі труднасьцямі—УСЁ ГЭТА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЛЕПШАЙ ЗАРУКАЙ ТАГО, ШТО РЭЧЫЦКІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЗОЙМУЦЬ ГАНАРОВАЕ МЕСЦА Ў НАШЫМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

Б. ПАПОЎ.

г. Рэчыца.

„Тэарэтыкі" капітулянцтва

Абсьледваньне работы **Кастрычніцкай ячэйкі КП(б)Б (Бабруйшчына)** паказала, што бюро ячэйкі дапусьціла грубыя палітычныя памылкі. Бюро ячэйкі капітулявала перад труднасьцямі работы, прымірэнча адносілася да скажэньняў лініі партыі, не змагалася з права-апартуністычнай практыкай асобных камуністых.

Частка партыйцаў выказвае яўна антыпартыйныя права-апартуністычныя погляды, адмаўляецца ўступаць у калгасы, дэзэртыруючы з фронту калгаснага будаўніцтва. Сваё капітулянцтва і дэзэртырства гэтыя «камуністыя» імкнуліся «тэарытычна» апраўдаць, даводзячы, быццам «нельга будаваць шмат калгасаў».

Гэтыя «тэарэтыкі» капітулянцтва, запісаўшыся ў калгас, нічога там не рабілі, зрываючы работу калектываў сваёй права-ўхілісцкай агітацыяй, даводзячы, што «раённы камітэт партыі праводзіць няправільную лінію, разгортваючы калгаснае будаўніцтва, спрыяючы арганізацыі вялікай колькасьці калгасаў». Паводле думкі гэтых партыйцаў, нельга будаваць шмат калгасаў, бо мы ня зможам іх абслугоўваць. У сапраўднасьці, такія разважаньні зьяўляюцца замаскаванай атакай на тэмпы калгаснага будаўніцтва, зьяўляюцца спробамі затармазіць арганізацыю новых камун і калгасаў.

Частка партыйцаў, што займала адказныя пасады ва ўстановах раёну, зраслася з кулацка-гандлярскімі элемэнтамі, капітуливала перад клясавым ворагам, спаўзаючы на рэйкі супрацоўніцтва і сяброўства з прыватнікамі, кулакамі і клерыкаламі. Старшыня с.-г. крэдытнага таварыства, старшыня спажывецкага таварыства і кіраўнік саўгасу (усе тры члены партыі) падтрымлівалі цесную сувязь з прыватнікамі, кулакамі і прыслужнікамі рэлігійнага культу. У апраўданьне сваёй капітуляцыі асобныя камуністыя даводзілі, што ў нас «кулакоў няма, што клясавая барацьба затухае» і г. д.

Бюро раённага камітэту партыі жорстка ўдарыла па канкрэтных праявах правага ўхілу і прымірэнцтва ў Кастрычніцкай ячэйцы. Бюро ячэйкі за правы апартунізм і прымірэнцтва распушчана. Зроблены адпаведныя арганізацыйныя вывады у адносінах да тых камуністых, якія супрацоўнічалі з клясавым ворагам, абаранялі інтарэсы куляцтва і зрывалі калгаснае будаўніцтва.

І. С—н.

Рупар кулацкай ідэалёгіі

Парт'ячэйка дала рэзкі адпор вылазцы правага апартуністага

Гэтымі днямі на сходзе партыйнай ячэйкі №-скага кавалерыйскага палка мела месца адкрытае паклёпніцкае выступленьне правага апартуністага, члена партыі **Цяпкіна,** якое па сутнасьці ператварылася ў кулацкую вылазку, у адкрытую агітацыю супроць генэральнай лініі УсеКП(б). У сваім выступленьні Цяпкін высунуў супроць партыі рад паклёпніцкіх абвінавачаньняў па асноўных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва, праявіўшы сябе яўным агентам кулацтва ў радох партыі. Спачатку Цяпкін скарыстаў вынрабаваныя мэтады правых апазыцыянэраў і абвінаваціў партыю ў няправільнай палітыцы адносна тэмпаў індустрыялізацыі нашай краіны, даводзячы іх нерэальнасьць і непасільнасьць і патрабуючы аддаць перавагу разьвіцьцю лёгкай індустрыі.

Гэта зьявілася толькі прадмоваю да атакі супроць лініі партыі, толькі пачаткам далейшай права-ўхілісцкай хлусьні і паклёпніцкіх антыпартыйных абвінавачаньняў. Цяпкін сьвядома абыходзячы відавочныя посьпехі партыі і рабочае клясы на сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, упарта даводзіў правільнасьць старых ілжывых тэорый правых апартуністых аб наўпасьці «дэградацыі» у сельскай гаспадарцы. Гіганцкі рост калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, пашырэньне, наперакор сабатажу кулацтва, пасэўнае плошчы і ўзмацненьне таварнай прадукцыі ураграмаджанага сэктару дапчэнту разьбілі капітулянцкія хныканьні правых аб «дэградацыі» сельскай гаспадаркі, аб эканамічным «заняпадзе» вёскі.

Для Цяпкіна выкарчоўваньне спадчыны «прышчэпаўшчыны» ў БССР, абрэзка кулацкіх гаспадарак і суцэльная калектывізацыя вёсак, сельсаветаў і раёнаў зьяўляюцца «разбурэньнем сялянскіх гаспадарак». Ясна, што вуснамі Цяпкіна ў даным выпадку гаварыў кулак, які шалёна супраціўляецца калектывізацыі вёскі, які адчувае ў магутным разгортваньні калектывізацыі наближэньне сваёй нямінучай пагібелі. Па пытаньні хлебазагатовак Цяпкін заявіў літаральна наступнае: «Хлебазагатоўкі праводзяцца прымусова, мэтадамі ваеннага камунізму, што ўдарыла па інтарэсах бедняка і серадняка». Гэта заява лепш за ўсё выкрывае сапраўдны твар апартуністага Цяпкіна, даводзіць антыпартыйную кулацкую сутнасьць яго ідэалёгіі, паказвае, што Цяпкін выступае ў ролі рупара кулацкай ідэалёгіі, у ролі агітатара і абаронцы за інтарэсы кулацтва.

Датэрміновае выкананьне плянавых заданьняў па хлебазагатоўках магчыма было толькі таму, што шырокія масы працоўнага сялянства, беднякі і сераднякі, горача адгукнуліся на заклік партыі і савецкай улады і прынялі самы актыўны, самы адданы і шчыры ўдзел у выкананьні хлебазагатовак. На заклік партыі і савецкай улады бядняцка-серадняцкія масы вёскі адказалі калектыўнай здачай хлебных лішкаў, арганізацыяй чырвоных абозаў і г. д. Заяўляючы аб «прымусовым» характары хлебазагатовак у адносінах да беднаты і сераднятства Цяпкін проста дыпляматычна ня выказаў сваёй сапраўднай думкі аб тым, што хлебазагатоўкі ўдарылі па інтарэсах кулака.

Пасьля таго, як сход ячэйкі працуча і жорстка асудзіў выступленьне Цяпкіна, ён ня толькі ня прызнаў сваіх памылак і адмовіўся ад сваіх паклёпніцкіх выпадаў супроць партыі, а працягваў іх разьвіваць і паглыбляць.

За прапаганду антыпартыйных поглядаў права-апартуністычнай апазыцыі, за яўна кулацкую агітацыю і адкрытае выступленьне з абаронай інтарэсаў кулацтва Цяпкін з партыі выключаны.

Я. ІВАШЫН.

НА СХОДЗЕ ЯЧЭЙКІ БДВ

Прэч з партыі носьбітаў, выразьнікаў і прапагандыстых нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі

Учора адбыўся сход ячэйкі БДВ, на які былі запрошаны члены ячэек НКА, Акадэміі Навук, працаўсьветы і друкарні «Зьвязды» Ячэйка ў парадак дня паставіла адно пытаньне: Аб палітычных памылках у кніжцы М. Зарэцкага «Падарожжа на новую зямлю». Уступнае слова зрабіў нам. загадчыка АПАД ЦК КП(б)Б т. **Будзінскі.**

Прамоўца ўзяў пад крытычны агляд наступныя творы Зарэцкага: «Голы зьвер», «Пад сонцам», «Крывічы», «Падарожжа на новую зямлю». Прааналізаваўшы гэтыя творы, т. Будзінскі выкрыў нацыянал-дэмакратызм і, параўнаўшы іх з публічнымі выступленьнямі аўтара, паказаў, што М. Зарэцкі цалкам знаходзіцца ў палоне ў клясавага ворага.

З рэзкай прамовай выступіў т. **М. Чарот.** За тым выступілі іншыя члены ячэйкі БДВ т. т. **Капента, Мінділін, Цьвікевіч, Паўлоўскі,** — яны адзначалі памылкі і шкоднасьць твораў Зарэцкага. Пасьля іх выступіў **М. Зарэцкі,** які ні на крок не адступіў ад сваіх нацыянал-дэмакратычных пазыцый.

Загадчык АПАД ЦК КП(б)Б т. **Сянкевіч,** сакратар Фрунзаўскага РК КП(б)Б т. **Л. Гурэвіч** і т. **Валабрынскі** адзначылі, што М. Зарэцкі ні наколькі не саступіў са сваіх нацыянал-дэмакратычных пазыцый, што ён служыць клясаваму ворагу, што партыя ня можа далей М Зарэцкага цярпець у сваіх радох.

Гэткую-ж ацэнку даў выступленьню М. Зарэцкага і т. Будзінскі ў сваім заключным слове.

Сход аднагалосна ўхваліў рэзалюцыю, у якой гаворыцца:

«М. Зарэцкі (Касянкоў) скарыстаў нарыс «Падарожжа на новую зямлю», як сродак для маскаванага нападу на генэральную лінію камуністычнай партыі.

Бюро ячэйкі КП(б)Б разглядае кніжку «Падарожжа на новую зямлю» ня толькі як антыпартыйную, але аб'ектыўна і як антысавецкую.

Бюро партыйнай ячэйкі пастанаўляе: выключыць М. Зарэцкага з радоў камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, як сьвядомага і ўпартага абаронцу шкодных і несумяшчальных з генэральнай лініяй партыі нацыянал-дэмакратычных шавіністычных поглядаў, ня гледзячы на рад папярэджаньняў, як з боку партыйнай ячэйкі, гэтак і і

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ МАЛАКОМ РАБОЧЫЯ ЦЭНТРЫ

ВЫТВОРЧАЯ КАНТРАКТАЦЫЯ МАЛАКА--АДЗІН З АСНОЎНЫХ СРОДКАЎ ЛІКВІДАЦЫІ МАЛОЧНАГА КРЫЗІСУ У ГАРАДОХ

СТЫХІЯ І АЖЫЯТАЖ НА МАЛОЧНЫМ РЫНКУ

Справа забесьпячэньня працоўнага на сельніцтва акруговых гарадоў і буйных прамысловых цэнтраў БССР малаком і малочнымі прадуктамі знаходзіцца ў вельмі нездавальняючым становішчы. Асабліва кепская справа задаволеньня малаком у Менску, Віцебску, Гомелі. Усе мерапрыемствы, якія дагэтуль прымаліся для зьнішчэньня крызісу, аказаліся невыстарчальнымі, бо ў значнай ступені малочна-жывёлагадоўчая каапэрацыя залежала ад пайнічыкаў, якія заносілі малако на зьліўны пункт тады, калі ім захочацца. Значную ролю ў гэтым пытаньні адыгрывалі цэны і ажыятаж на вольным рынку і паводзіны заможных і кулацкіх гаспадарак, накіраваныя на зрыў справы арганізаванай здачы малака.

Нават і асноўны стымул да здачы малака—выдача канцэнтраваных кармоў—слаба ўплываў на бесьперабойную і сталую здачу малака пайнічыкамі. Тлумачыцца гэта адсутнасцю дысцыпліны сярод апошніх, адсутнасцю сыстэматычнага і сталага арганізацыйнага і агратэхнічнага абслугоўваньня каапэраванага насельніцтва і слабым ахопам калектыўных гаспадарак. Гэта прыводзіла да таго, што пераважная большасьць малака і малочных прадуктаў збывалася калгасамі ў прыватным парадку, а не праз каапэрацыйны сэктар. Масла-сыраводы малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі (звыш 400) былі нагружаны толькі на 15 проц.

Вязумоўна, што такое становішча ў далейшым недапушчальна і нецярпіма.

ЯК ЛІКВІДАВАЦЬ МАЛОЧНЫ КРЫЗІС

Асноўнымі сродкамі зьнішчэньня стыхійнасьці і залежнасьці ад індывідуальных гаспадарак у справе забесьпячэньня рабочага насельніцтва малаком і малочнымі прадуктамі зьяўляюцца: 1) арганізацыя буйных прыгарадных малочных фэрм і калектыўных малочна-жывёлагадоўчых гаспадарак і 2) вытворчая кантрактацыя малака.

Калі для арганізацыі фэрм і малочных гаспадарак патрабуецца пэўны тэрмін, то да кантрактацыі малака трэба прыступіць зараз-жа, мабілізаваўшы да гэтай справы ўвагу і дапамогу ўсіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый вёскі і пралетарскіх і шэфскіх арганізацый гораду.

Кантрактацыя малака ў БССР і нават СССР—справа зусім новая, яна адрозьніваецца ад усіх іншых відаў кантрактацыі тым, што тут кантрактуецца не сэзонны прадукт сельскай гаспадаркі, а прадукт штодзённы.

Кантрактацыя малака павінна ахапіць усе лішкі малака кожнай сялянскай гаспадаркі і праводзіцца ў строга клясавым парадку.

Кантрактацыя малака павінна быць масавай. Гэта значыць, што яна ахапляе ўсе кароўныя гаспадаркі цэлай вёскі, населішча або групы населішч незалежна ад таго, ці зьяўляюцца гэтыя гаспадаркі пайнічыкамі ці не зьяўляюцца.

Кантрактацыя таксама ахапляе ўсе таварныя лішкі малака ўсіх калектыўных гаспадарак.

ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЗОАМІНІМУМУ

Калі з аднаго боку кантрактацыя малака будзе спрыяць паляпшэньню задаволеньня гарадоў малаком і малочнымі прадуктамі, то з другога боку яна дапаможа пашырэньню і паляпшэньню вытворчых працэсаў калектыўнай і бядняцка-серадняцкай гаспадаркі ў галіне малочнай жывёлагадоўлі і кормазабадбываньня. Яна (кантрактацыя) павінна спрыяць рэканструкцыі малочнай жывёлагадоўлі праз арганізацыю вытворчых населішчных малочна-жывёлагадоўчых т-ваў і дапамагаць перараспадзеньню апошніх у калектыўныя гаспадарки шляхам аграмаджаньня хлявоў, кармавых рэсурсаў, калектыўнай закладкі і пабудовы сілосных установак (ям, паўвежаў і вежаў), засеву калектыўных вучасткаў кармавымі расьлінамі (асабліва коранаклубняплодамі), калектыўнага паляпшэньня сенажацяй, калектыўнага ўтрыманьня злучных пунктаў (вытворцаў-паляпшацеляў) агразоатэхнічнага і вэтэрынарнага нэрсаналу (кантроль-асыстэнтаў, тэхнікаў-жывёлаводаў, вэтэрынарных фэльчароў і г. д.).

Таму кантрактацыя малака павінна быць зьвязана з абавязковым правядзеньнем агразоамінімуму, што павінна быць прадугледжана ў заключаемых калектыўных (групавых) дагаворах.

З тэй прычыны, што гэтыя мерапрыемствы патрабуюць пэўнага часу для іх ажыцьцяўленьня, кантрактацыя малака павінна быць доўгатэрміновай (3-5 год), як выключэньне, можа дапушчацца кароткатэрміновая кантрактацыя ў тых мясцох, дзе слаба разгорнута вытворчае каапэраваньне і калектывізацыя.

Кантрактацыя малака авансуецца выдачай у клясава-дыфэрэнцыяваным парадку канцэнтраваных кармоў, хлеба, насеньня кармовых расьлін, племяннога матар'ялу, крэдытаў на вытворчыя мэты, дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў (як цэмэнт для сілосных установак) і іншых сродкаў вытворчасьці, якія павінны забясьпечыць выкананьне агразоатэхнічных мерапрыемстваў, а таксама і павышэньне прадукцыйнасьці малочнай жывёлы.

Пералічаныя сродкі вытворчасьці павінны выдавацца толькі на калектыўныя і абагуленыя мерапрыемствы.

Канцэнтраваныя кармы будуць выдавацца толькі калектыўным, бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам, а хлеб звыш звычайнай нормы—бядняцкім гаспадаркам, а таксама і тым маламоцным серадняцкім гаспадаркам, якім не хапае хлеба.

Кулацкія гаспадаркі як абкладаныя ў індывідуальным парадку, так і неабкладаныя, поўнасьцю выключаюцца з усіх відаў авансавага вытворчага забесьпячэньня і крэдытаваньня, што зусім ня вызваліць іх ад поўнай здачы ўсіх лішкаў малака.

ДЗЕ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА КАНТРАКТАЦЫЯ

Эканамічная нарада БССР, якая разглядала пытаньне кантрактацыі малака, падышла да гэтай справы вельмі сур'ёзна, надаючы ёй надзвычайна важнае значэньне. ЭКАНА прызнала патрэбным у 29-30 годзе правесьці кантрактацыю малака ў першую чаргу вакол акруговых гарадоў і трох буйных прамысловых цэнтраў (Рэчыцы, Добруша і Шкло ва) і па адным раёне з найбольшай сеткай малочна-жывёлагадоўчых таварыстваў у Менскай, Віцебскай і Магілеўскай акругах з тым, каб вопыт гэтай работы перанесьці потым на большую тэрыторыю.

Некаапэраваныя гаспадаркі атрымліваюць 75 проц. нормы кармоў і 60 проц. нормы хлеба, што павінна стымуляваць больш шпаркае каапэраваньне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак праз кантрактацыю малака.

СУПРАЦІЎЛЕНЬНЮ КУЛАКОЎ СУПРОЦЬПАСТАВІЦЬ АРГАНІЗАВАНЫЯ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ

Такая рэзкая клясавая лінія ў правядзеньні кантрактацыі малака, якая зьяўляецца адзіна правільнай, выклічэ жорсткае і злоснае супраціўленьне з боку кулацкіх і варожых савецкай уладзе элемэнтаў на вёсцы.

Каб прымусіць кулацтва здаць поўнасьцю ўсе лішкі малака, каб перамагчы яго супраціўленьне, трэба супроцьпаставіць гэтаму арганізаваны шырокі грамадзкі ўдзел і садзейнічаньне ў правядзеньні кантрактацыі малака батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Райкомы і ячэйкі КП(б)Б, райвыканкомы, сельскія і местачковыя саветы разам з органамі малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі ў раёнах, дзе будзе праводзіцца масавая кантрактацыя малака, павінны прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні гэтай работы. Да кожнай вёскі і кожнага кулацкага двара павінна быць даведзена колькаснае заданьне на кантрактацыі малака.

Трэба абгаварыць на сходах беднаты, на пашыраных пленумах сельскіх і местачковых саветаў, на агульных сходах вёскі, населішча задачы і парадак правядзеньня кантрактацыі.

Пастановы бядняцка - серадняцкай большасьці гэтых сходаў павінны быць абавязковымі ня толькі для меншасьці, але і для тых, якія ня ўдзельнічалі ж пазбаўленыя права голасу, так і не пазбаўленыя, на гэтых сходах.

Шэфскія арганізацыі фабрык, заводаў і савецкіх, прафэсыянальных і гаспадарчых устаноў і арганізацый павінны выдучыць лепшых сваіх прадстаўнікоў, якія павінны падрыхтаваць і правесьці сходы і дагавары аб масавай кантрактацыі малака. Трэба памятаць і ведаць, што Белмалжывёласаюз і яго сыстэма без дапамогі мясцовых партыйных і савецкіх органаў, без вясковай і пралетарскай грамадзкасьці гэтай работы не правядуць з посьпехам

ЛІБМАН.

На хлебазагатоўках

ПРЫМУСІМ КУЛАКА ЗДАЦЬ ЖЫТА І ПШАНІЦУ

Першапачатковы плян загатовак хлеба па БССР выкананы на 5-е сьнежня на 138,1 проц., а павялічаны плян — на 104,3 проц.

На першым месцы ідзе Віцебская акруга, якая выканала 159,7 проц. павялічанага пляну. Перавысілі павялічаны плян Аршанская акруга, якая выканала 113,1, Магілеўская — 107,2 проц., і Менская—100,1% павялічанага гадавога пляну загатовак хлеба. Усё яшчэ адстаюць Бабруйская акруга, якая выканала 96,2 проц., Мазырская — 93,7 проц., Гомельская—98,2 проц., Полацкая — 95,7 проц.

Значна горш абстаіць справа з выкананьнем пляну паступленьня харчовых культур. Так, на 1-е сьнежня плян паступленьня харчовых культур выкананы на 82,1 проц. Дрэнна таксама абстаіць справа з паступленьнем жыта і пшаніцы. Удзельная вага жыта і пшаніцы ў агульных загатоўках складае ўсяго 46,3 проц.

Трэба дабіцца, каб кулакі свае цьвёрдыя заданьні выконвалі тымі культурамі, якія нам патрэбны. Месцы павінны дабіцца, каб яшчэ ў бліжэйшую пяцідзёўку ўдзельная вага жыта і пшаніцы ў агульных загатоўках была значна павялічана.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

АСІНБУД БУДЗЕ ПУШЧАНЫ Ў ЖНІЎНІ 1930 Г.

Пачалася падрыхтоўка работ 2-ай чаргі

Загадчык групы энэргетыкі ВСНГБ тав. РЫЎКІН, які вярнуўся з паездкі на Асінбуд, паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае:

— Добрая восень у значнай ступені спрыяла паскарэньню тэмпу будаўнічых работ. На галоўным корпусе станцыі работы скончаны амаль на 100 проц. Скончана яшчэ рад работ па пабудове фундамантаў для турбін, канапаў, галоўных майстэрань, паравознага дэпо каля станцыі Арэхі і інш.

Вузкакалейка ад тарфяных балот да тарфянога складу ў Арэхах гатова і адкрыта для праезду. Работа па перавозцы торфу для Асінбуду праводзіцца ў тры зьмены. Ужо загатоўлена каля 2 з паловай міл. пудоў торфу.

У бліжэйшы час будзе прыступлена да мантажу абсталяваньня на паніжальных падстанцыях у Віцебску, Оршы і Дуброўне. Устаноўка ліній, перадач ужо скончана. Падвеска медных правадоў пачнецца ў другім квартале па абтыманьні медзі.

У Арэхах заселены рабочымі 2 вялікія 3-х паверховыя дамы. Трэці дом заканчваецца. Усе будынкі — гарадзкога тыпу і абсталяваны водаправодам, электрычнасьцю, цэнтральным ацяпленьнем і каналізацыяй. Сёлета Белдзяржбуд пабудаваў яшчэ 8 каменных будынкаў, з якіх 7 для кватэр і 1—для пазьні і мэханічнай пральні. У будучым годзе пачнецца пабудова сямігодкі і больніцы. На тарфяных балотах у Шабанах будуецца яшчэ адзін рабочы пасёлак.

У Выдрыцы праведзена вялікая работа па добрабыце пасёлку — абсталяваны водаправод і каналізацыя.

Узмоцненым тэмпам ідзе падрыхтоўка спажыўцоў энэргіі Асінбуду. На пленуме камісіі па падрыхтоўцы спажыўцоў высьветлілася, што магутнасьць Асінбуду першай чаргі ўжо запоўнена. У сувязі з гэтым пачалася падрыхтоўка работ другой чаргі і ўстанаўленьне дадатковага турбагенэратара на 12 тысяч кілёват. Абсталяваньне заказана на савецкіх заводах.

У надыходзячым будаўнічым сэзоне ставіцца пытаньне аб падрыхтоўцы работ трэцяй чаргі Асінбуду для забесьпячэньня электраэнэргіяй раду новых прамысловых гігантаў, якія будуць скончаны пабудовай у бліжэйшыя пару год.

Тэмп будаўніцтва забясьпечвае свячасовы пуск Асінбуду ў жніўні 1930 году.

***

Галоўны інжынэр Асінбуду тав. АЛЕЙНІКАЎ вярнуўся з паездкі ў Бэльгію, Францыю, Нямеччыну, Швэцыю і Швайцарыю.

Тав. Алейнікаў разьмясьціў заграніцай заказаў на матар'ялы і высокавольтнае абсталяваньне на суму каля 1 мільёну рублёў, апрача турбагенэратараў, якія былі раней заказаны ў Швэцыі. Першая турбіна ў 10 тысяч кілёват прыбудзе з Швэцыі ў студзені, а другая турбіна ў 10 тысяч кілёват — у ліпені.

Тав. Алейнікаву ўдалося паскорыць выкананьне заказаў. Тэрміны атрыманьня імпартнага абсталяваньня забясьпечваюць свячасовы пуск станцыі.

М. К.

Тав. Ланцуцкі--у Барысаве

БАРЫСАЎ. (Па тэл. ад наш. кар.). 6 сьнежня вечарам у Барысаў прыехаў т. Ланцуцкі. На вакзале яго сустракалі дэлегацыі рабочых гораду. Быў нападжаны кароткі мітынг, на якім з прывітаньнямі выступалі рабочыя заводаў. У тэатры «Люкс» адбыўся масавы сход членаў МОПР'у, на якім т. Ланцуцкі выступіў з дакладам аб становішчы ў Польшчы. Учора т. Ланцуцкі наведаў гуту імя Домбаля, новую фабрыку запалак і «Чырвоную Бярэзіну».

З-я пазыка індустрыялізацыі

На мёртвым пункце

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Акруве было дана заданьне распаўсюдзіць сярод сялянства аблігацый 3 пазыкі на 194 тысячы рублёў. Фактычная падпіска да гэтага часу складае ўсяго 96 тысяч—толькі каля 50 проц. кантрольнай лічбы.

Гэта тлумачыцца тым, што ні сельскія саветы, ні камісіі садзейнічаньня не правялі належнай увагі да рэалізацыі пазыкі. Райвыканкомы і раённыя камісіі дзяржкрэдыту абмяжоўваліся пастановамі і абежнікамі, не кантрацявалі ходу падпіскі на вёсцы.

У асобных раёнах выкрыты недапушчальныя адносіны да рэалізацыі пазыкі. Хойніцкае с.-г. таварыства зусім сарвала падпіску. Васілевіцкае таварыства Рэчыцкага раёну ўзялося распаўсюдзіць на 4 тысячы рублёў, але не рэалізавала ні адной аблігацыі. У Лоеўскім раёне падпіска, пачынаючы з кастрычніка, стаіць на мёртвым пункце.

Асабліва адстае Брагінскі раён, дзе падпіска па сялянскім сэктары складае ўсяго 23 проц. заданьня, і Уваравіцкі—28 проц.

Мясцовыя арганізацыі павінны прыняць усе меры, каб нагнаць прапушчанае і навялічыць падпіску на вёсцы.

Аб старой машыне і новых людзях

Як рабочыя ф-кі „Спартак" павялічылі выпуск прадукцыі

(Ліст рабкора)

Паступова разгортвалася сацыялістычнае спаборніцтва на папяровай фабрыцы «Спартак», у якое ўцягнулася ўся рабочая маса фабрыкі. Кожны рабочы стараецца знайсьці што-небудзь новае ў вытворчасьці, прыстасавацца да працы так, каб дасягнуць лепшых вынікаў як у колькасьці, так і ў якасьці прадукцыі.

І гэтыя вынікі ўжо ёсьць.

Да гэтага часу першая папяровая машына (на фабрыцы ёсьць 3 папяровыя машыны) выробляла 4.500—5.000 кілёграм паперы за 8-мігадзінны рабочы дзень. Так было на працягу некалькіх год. Ніхто ня думаў, каб дасягнуць большага выробу. Наадварот, былі спробы давесьці, што нават пры перакансструяваньні машыны, якая зьяўляецца пастарэлай, большага выробу нельга і мысьліць. Асабліва такія разважаньні былі з боку інжынэра, загад. вытворчасьці, які самымі рознастайнымі спосабамі стараўся сарваць прапановы рабочых аб павялічэньні хуткасьці работы машыны. Інжынэру далі водпуск і ў гэты час, зрабіўшы некаторыя ўдасканаленьні, рабочыя пусьцілі машыну на хутчэйшы ход. І машына, ня гледзячы на довады інжынэра, замест заўсёдных 4.500—5.000 кілёграм пачала даваць 8.000 кілёграм за 8-гадз. рабочы дзень. Калі-ж пачалося сацыялістычнае спаборніцтва, то зьмена рабочых сетачніка Драгуна дасягнула на гэтай машыне рэкордных лічбаў: машына пачала выпускаць 8.600 кілёграм паперы за 8-гадзінны рабочы дзень. Прадукцыйнасьць працы павялічылася амаль што на 100 проц. І другія дзьве машыны па вопыце першай машыны за кошт павялічэньня тэмпу работы павялічылі прадукцыйнасьць працы амаль што на 25 проц.

Такім чынам несьвядомасьць і інэртнасьць былі пераможаны ініцыятывай рабочае масы, саміх рабочых. Больш таго, паводле прапаноў рабочых зроблены цэлы рад удасканаленьняў. Так, напрыклад, калі з-за мяжы былі выпісаны філігранныя каляндры і калі яны былі пушчаны ў ход, то папера, што праходзіла праз гэтыя каляндры, вельмі псавалася. Працавець далей ня было ніякай магчымасьці. І вось рабочы Станкевіч Язэп пачаў шукаць прычын. І знайшоў. Дарабіўшы некаторыя часткі, зрабіўшы ў канструкцыі каляндраў зьмены, Станкевіч дабіўся таго, што каляндары пачалі працаваць вельмі добра.

Калі-ж рабочыя тутунёвых фабрык Ленінграду, куды накіроўвалася прадукцыя фабрыкі «Спартак», зьвярнулі ўвагу спартакаўцаў на слабую якасьць папяроснай паперы, то спартакаўцы адразу-ж узяліся за паляпшэньне сваёй прадукцыі. Выявілася, што з прычыны адсутнасьці фільтравальнай станцыі, папера для папярос мела ў сабе шмат пяску. Гэта шкодзіла як апрацоўцы самой паперы, таксама і вырабу гільзаў на тутунёвых фабрыках. Тады старэйшы рабочы фабрыкі, працуючы амаль ад дня яе існаваньня, Харын Якуб, зрабіў сам прымітыўную фільтравальную станцыю; тут-жа каля машыны. Іншыя рабочыя таксама падавалі свае прапановы, якія безадкладна праводзіліся ў жыцьцё. У выніку ўсяго гэтага процант пяску ў паперы значна зьменшыўся; і цяпер ужо, ня гледзячы на значнае павялічэньне прадукцыйнасьці працы, скаргаў на дрэнную якасьць прадукцыі няма.

Побач з гэтым патрэбна адзначыць, што зараз вельмі разгорнута барацьба і за працоўную дысцыпліну. З кожным месяцам процант прагулаў зьмяншаецца. Няма тых выпадкаў сымуляцыі і хваробы, якія мелі месца раней. Папытайцеся ў рабочых, чым гэта тлумачыцца, і яны вам адразу адкажуць: «сацыялістычным спаборніцтвам».

Усе рабочыя каля сваіх варштатаў, усе на сваіх мясцох. У кожным цэху, пры кожным варштаце вывешаны «дошкі сацспаборніцтва», яны перадаюцца ад адной зьмены другой з усё большымі і большымі лічбамі дасягненьняў.

Папяровы цэх выклікаў на спаборніцтва мэханічны цэх на зьмяншэньне прастою папяровых машын, у выніку гэтага выкліку прастоі зьменшыліся на 2 проц.

За лепшую працу, за лепшыя адносіны да вытворчасьці, за добрую працдысцыпліну частка рабочых пастановаю агульна-фабрычнай канфэрэнцыі была прэміявана: іх камандыравалі на папяровую фабрыку Ленінграду, Добруш і інш., каб яны маглі падзяліцца сваёй практыкай і мэтадамі работы, і практыку і мэтады работы іншых фабрык ужыць на сваёй фабрыцы.

Пад лёзунгам спаборніцтва прайшла падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі, заданьне выканана больш, чым на 100 проц.

Адзначаючы вялікія дасягненьні фабрыкі ў выніку сацспаборніцтва, трэба спыніцца і на тых хібах ў рабоце фабрыкі, якія наглядаюцца ў апошні час.

Само сацыялістычнае спаборніцтва разгортваецца неяк стыхійна. Стыхійна тва. Яшчэ ў пачатку сацыялістычнага спаборніцтва былі заключаны дагаворы з 2 фабрыкамі. Прайшоў доўгі час, скончыўся гаспадарчы год, а між тым праверыць выкананы ўмовы ніхто не падумаў. Да гэтага часу ні адзін цэх, ні адна зьмена не абвясьцілі сябе ўдарнымі. Ні адзін рабочы не назваў сябе ўдарнікам. Няма пэрсанальных выклікаў, нічога ня чуваць аб ударных брыгадах, аб падрыхтоўцы да іх зьезду.

У некаторых цэхах (качагарках) нават зусім не адчуваецца спаборніцтва. Там усё ідзе пастарому. Досыць часта ў нас ужываецца прыказка «ў сям'і не бяз вырадка». Наглядаецца, што некаторыя больш адсталыя рабочыя не зразумелі мэты сацыялістычнага спаборніцтва і з іх боку можна чуць нараканьні на цьвёрдую працоўную дысцыпліну, на поўную нагрузку рабочага дня і інш.

В. А.

Дзе скажаюць дырэктывы наконт калектывізацыі

„Калі подсохне, паедзем арганізоўваць калгас"

САМАХВАЛАВІЧЫ (Наш кар.). Трэба адзначыць, што ў радзе сельсаветаў, Самахвалавіцкага раёну праца па калектывізацыі праводзіцца вельмі слаба; недаволі ажыцьцяўляецца і націск на кулацкі элемэнт.

Так ва Ўзьлянскім сельсавеце (в. Паляны) кулакі зьбілі камсамольца селяніна бедняка Паўловіча за тое, што яны на сходзе выступалі за арганізацыю калгасаў. Кулакі да таго абнаглелі, што не давалі беднаце браць ваду са сваіх студняў. Сельсавет, замест таго, каб арганізоўваць беднату і наступаць на кулацтва, праходзіць міма гэтых фактаў.

Член сельсавету в. Бахарэвічы, замест беднаты, склікае на сход тых, хто выступае супроць калгаснага будаўніцтва. Недаволі праводзіцца калектывізацыя і ў Дудзіцкім сельсавеце. Апошні засьмечаны чужым элемэнтам. Старшыня сельсавету **Стрынкевіч** падтрымлівае кулацтва, сакратар сельсавету—сын жандара.

Вясковае настаўніцтва Дудзіцкага і Вузьлянскага сельсаветаў, а таксама члены КСУ вельмі слаба праводзяць растлумачальную працу наконт калектывізацыі. Не адчуваючы ніякага адпору, Грэбянёўскі поп разьязджае па вёсках і наладжвае сходы кулацтва.

У некаторыя калгасы пралез клясавачужы элемэнт. Так, калгас «Расьсьвет» складаецца амаль выключна з адных пазбаўленых выбарчых праў. Члены гэтага калгасу падтрымліваюць сувязь з Амэрыкай і Эгіптам.

Пад боком Дудзіцкага сельсавету знаходзіцца прыватны млын. Беднята патрабуе яго перадачы калгасу, але гэтаму ніхто не садзейнічае.

Самахвалавіцкі РВК слаба кіруе працай сельсаветаў і амаль не рэагуе на ўсе гэтыя зьявішчы. Ёсьць асобныя члены партыі, якія зусім ня цікавяцца калгасным будаўніцтвам. Член партыі т. **Лапацік** лічыць, што «калі падсохне, тады паедзем арганізоўваць калгас». Ён мабыць, сьледуе прыкладу сакратара Самахвалавіцкага райкому партыі тав. **Астроўскага.** Калі прадстаўнік камвузу т. Драгун зьвярнуўся да тав. Астроўскага з запытаньнем наконт афармленьня арганізаванага ў Дудзіцкім сельсавеце калгасу імя Камвузу, дык Астроўскі адмёўся да гэтай справы вельмі няўважліва і не пацікавіўся нават, як працуе калгас.

Райкому партыі і РВК трэба палепшыць кіраўніцтва працай сельсаветаў і больш чула рэагаваць на ўсе ненармальныя зьявішчы, якія перашкаджаюць калгаснаму руху.

А. ФАНДАРЭНКА.

3-я пазыка індустрыялізацыі

На мёртвым пункце

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Акруве было дана заданьне распаўсюдзіць сярод сялянства аблігацый 3 пазыкі на 194 тысячы рублёў. Фактычная падпіска да гэтага часу складае ўсяго 96 тысяч—толькі каля 50 проц. кантрольнай лічбы.

Гэта тлумачыцца тым, што ні сельскія саветы, ні камісіі садзейнічаньня не правялі належнай увагі да рэалізацыі пазыкі. Райвыканкомы і раённыя камісіі дзяржкрэдыту абмяжоўваліся пастановамі і абежнікамі, не кантрацявалі ходу падпіскі на вёсцы.

У асобных раёнах выкрыты недапушчальныя адносіны да рэалізацыі пазыкі. Хойніцкае с.-г. таварыства зусім сарвала падпіску. Васілевіцкае таварыства Рэчыцкага раёну ўзялося распаўсюдзіць на 4 тысячы рублёў, але не рэалізавала ні адной аблігацыі. У Лоеўскім раёне падпіска, пачынаючы з кастрычніка, стаіць на мёртвым пункце.

Асабліва адстае Брагінскі раён, дзе падпіска па сялянскім сэктары складае ўсяго 23 проц. заданьня, і Уваравіцкі—28 проц.

Мясцовыя арганізацыі павінны прыняць усе меры, каб нагнаць прапушчанае і навялічыць падпіску на вёсцы.

500 чыгуначнікаў--у падшэфным калгасе

ГОМЕЛЬ (наш кар.). 7 сьнежня 500 рабочых чыгуначнікаў выехалі ў падшэфны калгас Буда-Кашалёўскага раёну.

Чыгуначнікі правераць работу камітэту сялянскай узаемадапамогі, дапамогуць перавыбарам камітэту, праверацъ работу каапэрацыі. Спэцыяльныя рабочыя брыгады выканаюць рад рамонтных работ у калгасе і бядняцкіх гаспадарках. Клюб чыгуначнікаў паспаў на вёску аркестр і драмгурток.

ЗМАГАЦЦА ЗА КОЖНЫ ВАЛЮТНЫ РУБЕЛЬ

Фарсаваць загатоўкі экспартнага сырцу, адкідаў і адходаў гаспадаркі і прамысловасьці

Саўгасы і калгасы, за перавышэньне пляну экспартных загатовак вы атрымаеце дадатковыя трактары

У сучасны момант, калі наша савецкая краіна сямімільнымі крокамі ідзе да індустрыялізацыі, калі выконваецца пяцігадовы плян вялікіх работ, прыходзіцца вельмі павялічваць імпарт усякіх машын і абсталяваньня. А такі імпарт мы зможам сабе дазволіць толькі тады, калі мы павялічым наш экспарт—адсюль зразумела тое вялікае значэньне, якое зараз набываюць усе пытаньні, зьвязаныя з пашырэньнем і паляпшэньнем экспарту.

НЕ СУПАКОІЦЦА НА ДАСЯГНУТЫХ ПОСЬПЕХАХ

Экспартны плян у Беларусі ў мінулым годзе выкананы поўнасьцю, нават в некаторым перавышэньнем супроць абавязковага пляну Савету Працы і Абароны. Усё гэта так, але мы ня можам і не павінны пераадэньваць дасягнутых у мінулым годзе посьпехаў, бо, пры агульным выкананьні пляна гадзьненя, мы па радзе відаў экспарту ўсё-ж мелі недавыкананьне, часамі даволі значнае. І гэта недавыкананьне нам трэба будзе нагнаць у гэтым годзе. Агульны экспартны плян па Беларусі ў гэтым годзе павялічаны на некалькі дзесяткаў процантаў.

Усё гэта прад'яўляе вельмі сур'ёзныя запатрабаваньні да тых арганізацый, якія прымаюць удзел у выкананьні экспартнага пляну.

ЧАМУ ЗЬНІЗІЎСЯ ТЭМП РАБОТЫ

Між тым, першыя месяцы новага гаспадарчага году—кастрычнік і лістапад—паказалі зьніжэньне тэмпу экспартнай работы—і гэта акалічнасьць прымушае нас забіць трывогу.

Загатоўчы апарат павінен неадкладна пераключыцца на экспартныя загатоўкі.

Наша спажывецкая каапэрацыя яшчэ мала ўцягнулася ў экспартную работу, а аб сельгаскаапэрацыі і гаварыць няма чаго,—яна яшчэ, можна сказаць, шчыль на не надыйшла да экспарту, асабліва калі гаварыць аб зборы другарадных экспартных тавараў.

РЫЗЬЗЁ—КАШТОЎНЫ ЭКСПАРТНЫ ТАВАР—НЕ СКАРЫСТОЎВАЕЦЦА ПОЎНАСЬЦЮ

Гаворачы аб асобных відах экспарту, мы перш за ўсё спынімся на рызьзі. Праўда, у мінулым годзе экспарт рызьзя ўзрос. Але ясна, што мы скарыстоўваем для экспарту далёка ня ўсё рызьзё, якое можна было-б сабраць (гэта асабліва датычыць гарадзкога рызьзя—і многа рызьзя—каштоўнага экспартнага тавару—прападае без карысьці па ўсякіх сьмяцьцёвых і выграбных ямах.

Да загатоўкі грыбоў нашы загатоўчыя органы прыступілі позна, спасылаючыся на позьні рост грыбоў, на неўраджай. Но адмаўляючы таго, што прыродныя умовы ў гэтым годзе ня спрылялі загатоўцы грыбоў, мы ўсё-ж павінны сказаць, што работа праводзілася вяла і многа грыбоў ня было зьнята з рынку.

БОЛЬШ УВАГІ АДКІДАМ І АДХОДАМ

Скарыстаньне для экспарту (і для ўнутранога рынку) усякага роду адкідаў і адходаў усё яшчэ не пастаўлена на належную вышыню. Яно яшчэ зусім не ўлічана. І гэта мы бачым усюды, як прамысловыя адходы, ці ўсялякі пакуль што не скарыстоўваецца, праўда, вельмі нязначны па сваім разьмеры (па Беларусі можа набрацца яго ў год некалькі тон), але затое вельмі каштоўны для замежнага рынку.

Або возьмем яшчэ драўнінную кару—яна таксама экспартуецца ў надзвычайна мізэрнай колькасьці ў параўнаньні з фактычнымі магчымасьцямі.

ТРАКТАРЫ САЎГАСАМ І КАЛГАСАМ ЗА ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ЭКСПАРТНАГА ПЛЯНУ

Зараз ставіцца на чаргу вельмі важнае пытаньне—аб скарыстаньні экспартных мер аграмаджанага сэктару нашай сельскай гаспадаркі Плян індустрыялізацыі саўгасаў і калгасаў нам трэба паставіць такім чынам, каб ён нам забясьпечваў прадукты для экспарту.

Трэба будзе скласьці дадатковае экспартнае заданьне для саўгасаў і калгасаў і прымяваць імпартнымі трактарамі тых, якія пакажуць перавыкананьне пляну. Наогул, у мэтах стымуляваньня экспарту, трэба будзе практыкаваць прэміраваньне асобных арганізацый і акруг за перавыкананьне экспартных планаў.

Не малое значэньне для посьпеху экспарту мае і правільная пастаноўка арганізацыйнай работы. Мы ня можам абмежавацца прапаноўкай экспартных плянаў у акруговым разрэзе—гэтым пляны павінны быць даведзены да нізавых зьвеньняў. Пры прад'яўленьні нізавому зьвяну плянавага заданьня мы павінны ясна і выразна паказаць яму, што такі і такі тавар загатаўляецца для экспартных мэтаў з тым, каб нізавая арганізацыя таксама несла пэўную долю адказнасьці за якасьць экспартных тавараў і за тэрміны іх адгрузкі.

АКРУГОВЫЯ НАРАДЫ ПА ЭКСПАРЦЕ ІСНУЮЦЬ... НА ПАПЕРЫ

Калі мы зоймемся аналізам тых прычын, якія тармозяць разьвіцьцё нашага экспарту, то гэты аналіз прывядзе нас да наступнага выводу—гэтыя прычыны непасрэдна зьвязаны са слабой увагай, якую месцы ўдзяляюць экспартным задачам. Акруговыя нарады па садзейнічаньні экспарту амаль што не працуюць і лічацца толькі на паперы. Некаторыя з іх нават ня зьбіраюцца, а некаторыя рэдка калі зьбіруцца і прышлюць у цэнтр пратакол пасяджэньня—сьлядоў-жа работы ніякіх ня відаць.

Можна было-б падумаць, што гэтымі нарадамі ніхто ня кіруе, ніхто за імі ня сочыць. Але вось у Наркамгандзі нас упэўняюць (хочам думаць, што гэта так), што з боку дырэктыўных органаў даваліся ня раз указаньні, рабіліся напамінаньні, патрабаваліся пляны работ, але ўсё дарма. У чым-жа тут справа? Трэба ў катэгарычнай форме патрабаваць тлумачэньня ад старшынь акрвыканкомаў.

З другога боку, наш друк (мы маем на ўвазе галоўным чынам акруговы друк) ня прыцягвае ўвагі грамадзкасьці да пытаньняў экспарту, спыняючыся на іх толькі рэдка, мімаходам. У выніку ўсяго гэтага экспартная кампанія праходзіць, можна сказаць, міма нашай грамадзкасьці, яе не закранаючы. А між тым, без актыўнай дапамогі грамадзкасьці мы ня справімся з нялёгкімі экс-

Усебеларуская нарада калгаснай і спэцыяльнай сыстэм

Як перабудаваць с.-г. каапэрацыю

Пераключыць галоўную ўвагу на абслугоўваньне калгасаў!

Дапамагаць пераходу на калектыўныя рэйкі бядняцка-серадняцкага сялянства!

Усебеларусткая нарада старшынь акруговых калгассаюзаў і спэцыяльных саюзаў сельска - гаспадарчай каапэрацыі, якая пазаўчора ўвечары адкрылася, амаль на працягу двух дзён займалася вырашэньнем пытаньня аб рэарганізацыі існуючай зараз сыстэмы сельска - гаспадарчай каапэрацыі.

Як вядома, гэта рэарганізацыя выклікана самім жыцьцём, у сувязі са шпаркім тэмпам калектывізацыі. Практыка паказала што пры сучаснай сваёй структуры наша сельска - гаспадарчая каапэрацыя ня можа задаволіць запытаньні калектыўнага руху.

Зусім правільную і свячасовую дырэктыву ў гэтых адносінах даў апошні пленум ЦК УсеКП(б). Больш практычна закранутае пытаньне было таксама вырашана Калгасцэнтрам СССР у канцы мінулага месяца.

Згодна пастановы апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) і дырэктыў Калгасцэнтру, старшыня Белкалгассаюзу тав. Сьмірноў і прапанаваў нарадзе разгледзець праект рэарганізацыі беларускай сыстэмы сельгаскаапэрацыі, распрацаваны гэтымі днямі праўленьнем Белкалгассаюзу.

У асноўным гэты праект зводзіцца да наступнага:

**Пры Белпаляводсаюзе і Беларускім малочна - жывёлагадоўчым саюзе арганізуецца цэнтральная аўтаномная сэкцыя калгасаў. Аналёгічныя сэкцыі ствараюцца пры адпаведных саюзах у ак

Запасы газы забясьпечваюць 2-месячныя патрэбы гораду

РАБОЧЫЯ, САЧЭЦЕ, КАБ ГАЗА НЯ ТРАПІЛА Ў СПЭКУЛЯНЦКІЯ РУКІ!

Дамо адпор спэкулянтам

За апошнія дні ў Менску мелі месца чаргі пры водпуску газы ў газавых крамах МЦРК. Мяшчанскія і спэкулянцкія элемэнты пачалі распаўсюджваць па горадзе хлусьлівыя контр-рэвалюцыйныя чуткі аб тым, што, быццам, няма газы. Рабілася і робіцца гэта спэкуляцыйнымі элемэнтамі з мэтай выклікаць паніку сярод насельніцтва, каб можна было перапрадаваць газу, якую яны купляюць у дзяржаўных крамах, па павышаных цэнах.

Звычайная дзённая норма газы для Менску — 13 тон. Але, за апошнія дні спэкулянты пачалі скуплёваць газу і за адзін дзень каапэрацыйнымі крамамі было прадана 45 тон. Такі спэкулянцкі ажыятаж, зразумела, зрывае плянавае забесьпячэньне насельніцтва газай. Між тым, у сапраўднасьці ніякіх падстаў для перабояў у забесьпячэньні газай няма. Запасы газы, якія маюцца на менскіх складах, забясьпечваюць нармальныя патрэбы гораду звыш чым на 2 месяцы. Газа, як і раней, будзе выдавацца насельніцтву без усялякай нормы.

Але побач з гэтым, пралетарская грамадзкасьць сама павінна даць рашучы адпор спэкуляцыйным элемэнтам, якія паспрабуюць сарваць плянавае забесьпячэньне насельніцтва. Трэба сачыць за тым, каб газа не пападала ў рукі спэкулянтаў

Трэба раз назаўсёды ў розных цёмных і контр-рэвалюцыйных элемэнтаў адбіць усялякую ахвоту зрываць нармальную работу нашых каапэрацыйных і рэгулюючых органаў.

СРОДКІ САМААБКЛАДАНЬНЯ ПАСТУПАЮЦЬ СЛАБА

Паводле даных Наркамфіну БССР на 1-е сьнежня збор сродкаў ад самаабкладаньня праходзіць вельмі слаба. На сялянскіх сходах пастаноўлена правесьці самаабкладаньне на 3 мільёны 630 тысяч рублёў—28 проц. у адносінах да сельска-гаспадарчага падатку. Да гэтага часу паступіла толькі 434 тысячы рублёў—12 проц. прынятых сходамі сум.

Лепш за ўсё праходзіць збор сродкаў самаабкладаньня па Мазырскай акрузе, дзе паступіла 20,7 проц. Вельмі дрэнна паступае самаабкладаньне ў Полацкай акрузе, (7,6 проц.), Гомельскай (6,1%) і Менскай (2,8 проц.).

Магутны хэмічны камбінат на Кабэляцкім масыве

Пры ВСНГ БССР адбылася нарада з удзелам прадстаўнікоў Дзяржпляну, інэстытуту прамысловасьці і інш. зацікаўленых арганізацый, на якой абмяркоўвалася пытаньне аб пабудове ў БССР магутнага энэрга-шкла-хэмічнага камбінату на Кабэляцкім тарфяным масыве капя г. Гомелю, які мае да 113 міл. куб. мэтраў торфу на плошчы ў 7.364 гэктары.

Нарада прызнала магчымым пабудаваць на гэтым тарфяным масыве ў 1932-33 годзе 2-ю раённую электрастанцыю, мэханізаваную гуту, коксахэмічны і тарфяны заводы.

Торф, які будзе здабывацца на Кабэляцкім торфа-заводзе, будзе непасрэдна падавацца на кокса-хэмічны завод, дзе ён часткова падлягае поўкаксаваньню і часткова поўнаму каксаваньню. Газ і поўкокс, якія атрымліваюцца ў працэсе гэтае работы, будуць скарыстаны: газ — для хэмічнай вытворчасьці, паўкокс, пасьля размолу на пыляпрыгатоўчым заводзе, паступае ў кацёльную электрастанцыю і спальваецца пад катламі. Прадукты поўнага каксаваньня пойдуць для патрэб гуты і на рынак для патрэб мэталюргіі.

Пабудова такога камбінату будзе мець важнае значэньне ў справе далейшага разьвіцьця прамысловасьці Беларусі.

Нарада вызначыла камісію спэцыялістых для ўсебаковай распрацоўкі гэтага пытаньня. Матар'ялы камісіі будуць разгледжаны на спэцыяльнай тэхнічнай нарадзе пры ВСНГБ у бліжэйшы час.

ДАДАТКОВЫ НАБОР 700 ВУЧНЯЎ У ШКОЛЫ ФЗУ

Адкрываецца рад новых школ

Прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў правесьці дадатковы набор 700 вучняў у школы фабзавучу. Адкрываецца рад новых школ — пры заводзе «Пралетарыя» ў Гомелі на 70 чалавек, школа тарфянікоў-дзесятнікаў пры Белторфтрэсьце на 40 чалавек, школа фабзавучу пры панчошна-трыкатажнай фабрыцы ў Віцебску — на 70 чалавек, школы стройвучу ў Гомелі і Магілеве на 170 чалавек.

Апрача таго, будуць прыняты дадаткова ў фабзавуч абутнікаў у Віцебску 100 чалавек, тэкстыльны фабзавуч пры фабрыцы «Дзьвіна» — 70, фабзавуч Лесбелу пры Бабруйскім камбінаце — 65, у школу стройвучу — 50 чал.

Трэстам запрапанавана ў працягу сьнежня і студзеня правесьці дадатковы набор, а новыя фабзавучы адкрыць да 10 лютага.

ВЫКАНАЦЬ ПЯЦІГОДКУ Ў 4 ГАДЫ

25 сьнежня—другі дзень індустрыялізацыі

Пастанова сходу грузчыкаў ст. Менск

Агульны сход грузчыкаў Менскага чыгуначнага вузла пастанавіў працаваць 25 сьнежня без замены выхадным днём і заработак перадаць у фонд індустрыялізацыі краіны.

Агульны сход выклікаў іншыя прадпрыемствы мясцовага транспарту.

2 аблігацыі на індустрыялізацыю

Уношу ў фонд індустрыялізацыі 2 аблігацыі 6 проц. выйгрышнай пазыкі 1922 году і выклікаю пасьледаваць майму прыкладу ўсіх працаўнікоў Лесбелу.

Працаўнік Мсьціскага вучастку Лесбелу **Панчанка.**

Залатыя рэчы ў фонд індустрыялізацыі

На 1-ым вытворчым сьвяце рабочых друкароў Менску выступіла жонка рабочага т. **Міхалевіч** з прапановай—**усім жонкам рабочых і дэлегаткам унесьці залатыя рэчы ў фонд індустрыялізацыі.**

Тав. Міхалевіч тут-жа ўнесла залатыя пярсьцёнкі.

Рэзалюцыя польскай сэкцыі БелАПП'у

Некалькі дзён назад паведамлялася аб здрадзе польскага пісьменьніка Панскага-Сольскага, які паехаў за граніцу лічыцца і адмовіўся вярнуцца ў СССР.

Польская сэкцыя БелАППу вынесла рэзалюцыю, якая ганьбіць Сольскага, як здрадніка пралетарскай рэвалюцыі. У рэзалюцыі гаворыцца:

«Сярод пісьменьніцкі колаў мы мелі контр-рэвалюцыйныя выступленьні А. Дудара, Б. Пільняка, мелі агідны факт здрады пралетарскім масам Панаіта Істраці. Аднак, здрада Панскага ёсьць яшчэ больш агіднейшая, ён хаваў ад пралетарскіх мас сваю істоту Панскі прадаўся капіталу».

За сувязь з прыватнікам да адказнасьці

На фабрыку **«Камінтэрн»** (Барысаў) быў прыняты для працы нейкі Бэрнштэйн, які скарыстоўваў дзяржаўную гаспадарчую ўстанову ў сваіх карысьлівых мэтах.

Прыватнік Бэрнштэйн атрымліваў дэфіцытныя прадукты—вырабы заводу—і больш таго, змог атрымаць дакументы, што ён зьяўляецца камівяжэрам. Ён пад шыльдай дзяржаўнай арганізацыі праводзіў свае асабістыя справы. У выніку чаго на практыцы была дапушчана праява правага ўхілу з боку дырэктара заводу, яго намесьніка і загадчыка складу. Бюро калектыву КП(б)Б ня ўгледзела своячасова шкодных сувязі заводу з прыватнікам.

Гэта справа разглядалася ў належных органах. Былому дырэктару заводу **Блоцкаму,** намесьніку **Крыўко** і загадчыку складам **Букаву абвешчана вымова.** Бюро райкому КП(б)Б распусьціла бюро калектыву КП(б)Б заводу.

Прапанована пам. пракурора ў тэрміновым парадку аформіць гэту справу і матар'ял перадаць судовым органам.

Самарцы дапамагаюць праводзіць пяцігодку

У **Самарскай дывізіі** падпіскай на 3 пазыку ахоплены ўсе катэгорыі ваеннаслужачых. Асабліва добра рэалізавана пазыка сярод начскладу і чырвоناармейцаў 1906 г.

Агульная сума падпіскі ў хуткім часе дасягне 90 тысяч руб.

Сярод папаўненьня праведзена падпіска звыш, чым на 11 тысяч рублёў. На першым месцы ідзе Стаўропальскі полк.

Самарцы актыўна дапамагаюць будаваць пяцігодку.

Г. Шыфрын.

МЕНСК

КАЛГАСЬНІКАЎ НА КУРОРТЫ

Наркамат Аховы Здароўя разьмеркаваў па акругах 16 дармовых месц спэцыяльна для хворых калгасьнікаў на курортах Каўказу і Крыму. У бліжэйшыя дні сярод калгасьнікаў будзе разьмеркавана яшчэ 15 месц.

Мільён рублёў на будаўніцтва мэханізаванай гуты

ВСНГ СССР адпусьціў мільён рублёў на будаўніцтва новай мэханізаванай гуты каля Гомелю. Ужо падрыхтаваны праект гуты. Кошт яе вызначаны ў 6-7 мільёнаў рублёў. У гэтым годзе вялася распрацоўка тарфяных балот.

Рабочых--на адказную работу ў дзяржапарат

ЦП саюзу швэйнікаў выпучыла 26 рабочых швэйных фабрык Беларусі і нізавых прафпрацаўнікоў на адказныя пасады ў дзяржапараце. Апрача таго, 5 рабочых выпучаюцца для работы ў МЦРК.

Курсы рахункаводаў для калгасаў

Менакркалгасаюз арганізаваў у фэрме «Курасоўшчына» (каля Менску) 2-хмесячныя курсы рахункаводаў-калгасьнікаў. Калгасьнікі і камунары навучацца рахункаводзтву, каб пасьля ўмець весьці добры вучот кожнай галіны працы ў калгасе або камуне.

ЗА ДЗЕНЬ

«Тыдзень інжынэра і тэхніка». У гэтым месяцы ў Менску будзе праводзіцца «тыдзень інжынэра і тэхніка». Мэта гэтага тыдню—прыцягнуць увагу рабочых мас да работы сэкцый ІТС, уцягнуць больш інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў у сацыялістычнае будаўніцтва і грамадзкую работу і г. д. Рэспубпрацаўнікоў у. сацыялістычнае будаўніцкоў наладжвае вечар змычкі з рабочымі будаўнікамі.

Курсы мэліяратараў. Курсы па падрыхтоўцы мэліяратараў для Біра-Біджану адкрываюцца ў гэтым-жа месяцы ў Менску. На курсы будзе прынята 100 чалавек з яўрэйскай бядняцкай моладзі мястэчка.

Рэарганізацыя сельгаскрэдытных т-ваў

Белсельбанк праводзіць рэарганізацыю крэдытных таварыстваў на мясцох. Усе крэдытныя таварыствы, якія знаходзяцца не ў раённых цэнтрах, будуць рэарганізаваны ў вытворчыя каапэрацыйныя аб'яднаньні. Крэдытныя таварыствы, якія знаходзяцца непасрэдна ў раённых цэнтрах, будуць рэарганізаваны ў банкаўскія крэдытныя таварыствы. Апошнія пасьля рэарганізацыі ня будуць праводзіць збыта-забясьпечваючых апэрацый. Гэтыя функцыі перадаюцца спэцыяльным раённым саюзам сельгаскаапэрацыі, якія зараз арганізуюцца ва ўсіх раёнах.

Бюро скаргаў РСІ—на абутковай фабрыцы

Рабочыя Менскай абутковай фабрыкі скардзіліся ў НК РСІ наконт парадкаў у аддзеле камунальнай гаспадаркі. Пад сукном стала загадчыка жыльлёвага паддзелу **Двоськіна** ляжаць без усялякіх вынікаў на працягу доўгіх месяцаў заявы наконт кватэр. Рабочым фабрыкі, якія жывуць у калідорах і самых дрэнных пакоях, прыходзіцца месяцамі хадзіць у камгас, чакаць у чарзе, бяз усякага толку.

Бюро скаргаў НК РСІ абмяркоўвала гэтае пытаньне на рабочым сходзе, на абутковай фабрыцы. Рабочыя, якія выступалі ў спрэчках, выкрылі рад абураючых фактаў цяганіны і бюракратызму ў жыльлёвым стале камгасу.

Бюро скаргаў вынесла вымову загадчыку камгасу **Нячаеву** і паставіла на від **Двоськіну.** Ім прапанавана больш уважліва і чула адносіцца да разьмеркаваньня кватэр і зьнішчыць бюракратызм, які наглядаецца ў жыльлёвым стале.

БОШ.

„Зьвязда" дапамагла

Непарадкі ў польскай школе выкрыты

Некалькі тыдняў таму назад «Зьвязда» пісала аб непарадках у польскай школе і дзіцячым доме ў Бабруйску.

Пры абсьледваньні польскай школы і дзетдому выкрыты хворыя зьявішчы, якія выяўляліся ў грубым праўленьні антысэмітызму, цкаваньні двух вучняў яўрэяў і распаўсюджваньні сярод вучняў антысэміцкіх і контр-рэвалюцыйных вершаў. Мела месца скрыўленьне кіравай лініі ў адносінах да дзяцей беднаты. Загадчык школы скарыстоўваў двор і кватэры школы, як прытулак для заможных сялян, якія прыяжджалі ў касьцёл.

На працягу некалькіх год настаўніца **Райхэнбах,** якая выкрывала непарадкасьці ў школе, падлягала ганеньню, а потым была звольнена з працы.

Партыйцы і камсамольцы, якія працавалі ў школе і дзетдоме, не далі рашучага адпору наступленьню капіталістычных элемэнтаў, а наадварот яны падпалі пад уплыў загадчыка школы Аляшкевіча. Самакрытыка была ў заняпадзе. У выніку чаго існавала ў калектыве сямейнасьць, кругавая парука, дзяцей дапускаліся грубасьці, няўважлівыя адносіны і мела месца злачынная безгаспадарчасьць (пакіданьне дзяцей без абеду, пасылка да шаптуна, замазваньне фактаў антысэмітызму і г. д.).

Гаррайком КП(б)Б прыняў цэлы рад канкрэтных арганізацыйных мерапрыемстваў па аздараўленьні школы і дзетдому. Партыйцы прыцягнуты да партыйнай адказнасьці. Справа перадана пракуратуры і г. д.

Пастаноўлена **зьняць з працы загадчыка школы Аляшкевіча.**

Сакратарыят акругкому КП(б)Б прапанаваў акрана і фракцыям адпаведных устаноў узмацніць кіраўніцтва школай і дзетдомам, прыняўшы захады да паляпшэньня складу настаўніцтва.

Справа абаронцы Коўзуся

«Зьвязда» ў свой час паведамляла аб тым, што праваабаронца **Коўзусь** взвалціў сваіх двывёх хатніх работніц. Адна з іх **Марыя Садавін,** якую Коўзусь выгнаў на вуліцу, скончыла жыцьцё самагубствам. Па заметцы ў «Зьвязьдзе» было праведзена сьледзтва, якое пацьвердзіла зазначаныя факты. Расьпусьнік быў арыштаваны і перададны суду.

Справу Коўзуся разглядае сёньня народны суд 1-га вучастку пад старшынствам т. Мазо. Абвінавачвае на справе прадстаўнік акруговай пракуратуры. тав. Шмідт, а таксама грамадзкі абвінаваўца ад саюзу нархарч.

ЗА МАРЫНАВАНЬНЕ ЗАМЕТАК—ДА АДКАЗНАСЬЦІ

У № 227 газэты «Зьвязда» пісалася, што ў некаторых сельсаветах Пухавіцкага раёну марынуюцца заметкі, якія пасылаюцца рэдакцыямі на расьсьледваньне. Менакрпракуратура паведамляе, што факты, паказаныя ў заметцы, пацьвердзіліся. Новасёлкаўскі, Балоцкі і Гарэліцкі сельсаветы, а таксама і аграном Пухавіцкага раёну марынавалі заметкі па 4 месяцы.

Вінаватыя ў марынаваньні заметак прыцягваюцца да адказнасьці.

ПАЧЫН ЖАКТУ № 16

Першая грамадзкая кухня ў БССР

Грамадзкім харчаваньнем яшчэ не ахоплены шырокія працоўныя масы. Сталоўкі ЦРК яшчэ ня могуць у належнай меры абслужыць наведвальнікаў. Асабліва дрэнна стаіць пытаньне з якасьцю абедаў, з абслугоўваньнем і г. д.

Некаторая частка рабочых і служачых да гэтага часу яшчэ сталуецца ў прыватнікаў.

Праўленьне ЖАКТ'у № 16, каб унікнуць гэтага, вызваліць жанчын ад гаршкоў, зрабіла **пачынаньне ў арганізацыі грамадзкай кухні пры сваім Жакце.** Ініцыятарам гэтай справы зьявіўся тав. **Сільнікаў.** Ён апытаў рад рабочых і служачых, якія жывуць у Жакце № 16 аб згодзе харчавацца з грамадзкай кухні. Ужо запісалася 20 сем'яў. Гэта лічба з кожным днём павялічваецца.

Зараз пры Жакце абсталёўваецца кухня і ў хуткім часе адбудзецца ўрачыстае яе адчыненьне.

Белжылсаюз чула адгукнуўся на арганізацыю грамадзкай кухні і садзейнічае гэтаму пачынаньню. Дармова дае інструктара - куліпара, які на працягу некалькіх месяцаў будзе працаваць на кухні і падрыхтуе спэцыялістых па грамадзкім харчаваньні з хатніх гаспадынь.

Зараз у Менску налічваецца звыш 22 Жактаў. Белжылсаюз мяркуе ў гэтым годзе арганізаваць грамадзкія кухні пры 50 проц. Жактаў.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛКОРАЎ

Брыгадзіры па низьве

Яшчэ ў пачатку лета г. г. на **лесазаводзе «Праца»** (Мазырская акруга) арганізавалася ўдарная брыгада. Ніхто ёю не кіраваў, ніхто не зварачаў увагі на яе работу, і брыгада распалася. У лістападзе завод атрымаў прапанову: «выслаць 2 дэлегатаў ударнікаў на канфэрэнцыю ўдарных брыгад».

Заўком ня ўдарыў тварам у гразь. Склікаў сход, які выбраў 2 дэлегатаў на канфэрэнцыю. Дэлегаты не атрымалі ніякай інструкцыі і ня ведаюць, што яны павінны сказаць на канфэрэнцыі, бо дасягненьняў на заводзе няма.

Вось як выконваюцца ў нас дырэктывы.

РАБОЧЫ.

Гняздо трутняў у Калінкавіцкім лясьніцтве

Для таго, каб дастаць мукі па танній цане на кармленьне сваіх кароў і сьвіней, Сінельнікаў (лясьнічы Калінкавіцкага лясьніцтва) і Міневіч (бракер лесазагатовак) пахаўрусавалі з улясьнікам Міхнавіцкага млыну Кецлахам. Лясьнічы і яго зграя даюць Кецлаху дровы, а ўзамен атрымліваюць муку. Апрача гэтага, фураж для рабочых на лесазагатоўках таксама міма лясьнічага і яго хаўрусьнікаў не закранутым не прайшоў. Так, муку-каласоўку выдалі рабочым, а добраякасную пшанічную муку (больш за 30 пудоў) забралі сабе. Рабочым за ўсім гэтым пільна сачыў, за што і атрымаў 1 куль мукі і 300 руб. грошай, нібы ў якасьці прэміі «за актыўны ўдзел у гаспадарчых загатоўках».

Але мала таго, лясьнічы Сінельнікаў фіктыўна залічыў на сваё ўтрыманьне дачок свайго цесьця—папа Кадуш,—якія былі выключаны з Пятрыкоўскай сямігодкі, як працоўны элемэнт. Гэтых пападзянак, як сваіх утрыманак, Сінельнікаў прыладзіў у Калінкавіцкую чыгуначную сямігодку. А яго хаўрусьнік Міневіч, пры актыўным падтрыманьні Сінельнікава, выжыў з лесазагатовак вылучэнцаў-дзесятнікаў партыйцаў Казінцова, Барбасава, Лаўрова, Мардусэвіча, і прыстроіў на іх месцы сваіх прыяцеляў, сярод якіх ёсьць і яго брат Міневіч Нахман.

Камісія па чыстцы савецкага апарату павінна разварушыць зграю гэтых трутняў і выкурыць з Калінкавіцкага лясьніцтва.

ПАЛЯШУК.

Ад Мен. АКК КП(б)Б

Мен. АКК, зьмяшчаючы наступны дадатковы сьпіс таварышоў, вызначаных у члены праверкомаў, просіць усе ячэйкі КП(б)Б абмеркаваць гэтыя кандыдатуры на чарговых партсходах і калі будуць адводы, у дзесяцідзённы тэрмін паведаміць аб гэтым АКК (вул. Энгельса, 28).

СЬПІС ТАВАРЫШОЎ, ВЫЛУЧАНЫХ У ЧЛЕНЫ ПРАВЕРКОМАЎ:

1. **ШАНДЫБІН, Георгі Сяргееў,** член партыі з 1919 году, рабочы, працуе на станцыі Барысаў.
2. **СЕМЕНАВЫЧАЎ, Хведар Міхасёў,** член партыі з 1919 г., рабочы, працуе на зав. імя Леніна.
3. **БАБЫЛЁЎ, Ян Янаў,** член партыі з 1920 г., рабочы, працуе на шкіпінарным заводзе.
4. **ЛУНКОЎ, Апанас Сьцяпанаў,** член партыі з 1919 г., рабочы, працуе ў групкоме харчавікоў.
5. **ПАЎЛОЎСКІ, Базыль Язэпаў,** член партыі з 1917 г., рабочы.
6. **БЕЛАШЭВІЧ, Антось Міхасёў,** член партыі з 1919 г., рабочы, працуе на ст. Барысаў.
7. **АЎРЭЙЦЭВІЧ, Станіслаў Язэпаў,** член партыі з 1918 г., служачы, працуе ў Барысаўскім РВК.
8. **СЕРАФІМОЎСКІ, Аляксандар Людвікаў,** член партыі з 1917 г., рабочы, працуе на гуце імя Домбаля.
9. **ВАЛОДЗІН, Карп Янаў,** член партыі з 1919 г., рабочы, сакратар ячэйкі сав. устаноў у Барысаве.
10. **ЗАВЯЛАЎ, Сяргей Міхасёў,** член партыі з 1919 г., рабочы, працуе ў Белдзяржсьпірце.
11. **МЭЛАМЭД, Гдальля Хем'оў,** член партыі з 1920 г., рабочы, працуе ў ГЭТ'е.
12. **ВЕГ, Дзюп Адамаў,** член партыі з 1919 г., рабочы, працуе ў саўгасе Санжаны.
13. **НОМАЛЬ, Міхась Францавіч,** член партыі з 1914 г., селянін, працуе ў саўгасе імя Лекерта.
14. **АШАК, Янка Юр'яў,** член партыі з 1914 г., рабочы, працуе ў НКУС.
15. **ПЛЕШАКОЎ, Пятро Хведараў,** член партыі з 1918 г., рабочы, працуе ў Кастрычніцкім РК партыі.
16. **ГОЛІКАЎ, Павел Сямёнаў,** член партыі з 1918 г., рабочы, знаходзіцца ў яч. праўгасу БДУ.
17. **ГУСЕЎ, Ян Андрэяў,** член партыі з 1919 г., рабочы, знаходзіцца ў ячэйцы праўгасу БДУ.

Старшыня Менскай АКК КП(б)Б **ДАМБРОЎСКІ.**

Паведамленьні

СЁНЬНЯ

Дом Асьветы. Агульны сход ячэйкі ЛКСМБ Працасьветы—у 19 гадз.

Клюб Нархарч. Чарговы дэлегацкі сход жанаддзелу хатніх работніц—у 15 гадз.

Выклікаюцца на 19 гадз. у Кастрычніцкі райком МОПР'у старш. і сакр. яч. МОПР'у: АБВШ, мясцком № 2 тавар, Белмэдгандлю, групк. працасьветы пры 3 школе, групк. працасьветы МВБ, яўр. клюбу імя Леніна, НКЮ, страхкасы, саўгандальфлёту, арцелі «Самавязь», УМТ'у, сямігодкі № 20, яўр. пэдтэхнікуму, мясц. № 1 пасажыр., жакту № 19, палаты мер і вагі.

ЗАЎТРА

Рэсп. Бюро АРУ. Сход рахункоўных працаўнікоў бюджэтных устаноў—18 гадз. (НКФ, Савецкая, 45, заля бюдж. кіраўн.).

Дом Камасьветы. 12-XII ў 19½ гадз. даклад т. **Васкабойнікава** для ніз. парт. і камс. акт. на тэму: «Міжнароднае становішча СССР». Уваход па парт. і камс. біл.

Пасяджэньне таварыства гісторыкаў марксыстых у 20½ гадз. у камвузе (Ленінскі габінэт). Дакл. т. Віткоўскага.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Нарада выкладчыкаў ВСПШ па паліт. і агульна-адукац. дысцыпл. 1 і 2 курсу ў 18 гадз. (буд. Мен. АК КП(б)В).

Дакладчыкамі для правядзеньня антыкалядняй кампаніі вылучаюцца т. т. Выдра, Сэрбэнта, Тыманюк, Эпштэйн, Данільчык і Вайнштэйн—камвуз, Ігнатоўскі, Віткоўскі, Шкільтар, Казак, Валабрынскі і Бялуга—Акадэмія Навук; Шымянскі і Ермакоў—акр. інспэкт. нарасьветы; Даўтаполаў і Калінічэнка—белпэдтэхнікум; Шукевіч-Трацьцякоў—«Бел. Вёска»; Цьвікевіч, Шыпіла, Карунчыкаў і Чарот—Белдзяржвыдавецтва, Мазур—Н. К. А., Мацюкевіч—газ. «Савецкая Беларусь», Парук—рабфак, Красьнеўскі—«Зьвязда», Калмык—ЦК МОПР'у, Велунас—літ. бюро ЦК КП(б)Б, Шэрагаў—газ. «Рабочий», Вайяр, Шейнін—Белдзяржгандаль, Дунец, Ошараў—газ. «Акцябр», Зарэмкі—прафшкола, Шашкоў—дасьледч. школа, Кукелка—польпэдтэхнікум, Ліўшыц, Барсукоў, Граеўская—НКАховы Здароўя, Шапіра—2 саў. больніца, Шымкевіч—3 агульн. адук. курсы, Гос—1-я школа, Фішар—Дзяржстрах.

Усім гэтым таварышом зьявіцца ў агітпрапгабінэт 11-XII у 19 гадз. для кансультацыі (Дом Камасьветы).

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Бібліяграфія

Літаратура па мэліярацыі

(Кароткі агляд кніжок, выд. „Сялянскай бібліятэкай" Белдзяржвыдавецтва)

П. Саўкін—«Кароткі дапаможнік па асушцы тарфяных балот». Выд. БДВ, 1929 г., г. Менск, стр. 50, цана 38 кап.

Зьмест. Утварэньне балот і тарфяных глеб. Асаблівасьці элемэнтаў клімату балотных раёнаў. Хэмічны склад тарфяных грунтаў. Фізычныя ўласьцівасьці тарфяных глеб. Якія тарфянікі годныя для зямляробства. Асушка тарфяных балот з мэтай іх с.-г. скарыстаньня. Асушка балот дрэнажом. Спосабы вырабку тарфяной глебы і засеў расьлін. Утварэньне на тарфяных глебах. Культура с.-г. расьлін на тарфяной глебе. Запусканьне пад сенажаць тарфяных балот. Пустазельле на тарфяных глебах. Эканамічны бок культуры тарфяных балот.

Карысная кніжка. Коратка і зусім грунтоўна выкладае пытаньні ня толькі асушкі балот, але і культуры балот. Выкладаньне яе, мову кніжкі трэба прызнаць больш адпаведнымі не для сялянскага чытача, а для асоб, якія добра знаёмы з асновамі прыродазнаўства і агранаміі— гэта бліжэй да чытача тыпу раённых аграномаў і мэліяратараў і студэнтаў сярэдніх палітэхнікумаў.

Хоць і ня істотнымі, але ўсё-ж **хібамі кнігі** трэба прызнаць няясьнасьць крыніц, якімі аўтар карыстаўся для лічбаў, што ён падае ў сваім матар'яле: стар. 9—хэмічны склад торфаў з мохавага і лугавога балот; Стар. 27—аб прыстасаваньні прылад для апрацоўкі глебы; стр. 28—аб першай расьліне на балоце; чамусьці ў радзе першых расьлін, падрыхтоўваючых глебу, прапушчаны клубняплоды і кораньплоды; стр. 42-43—пратручваньне мешаніны для лугоў; стр. 44—аб разьвіцьці пустазельля; стр. 46-49—разьлікі па эканоміцы культуры балот.

Акрамя таго: няма даных па велічыні асадкі балот пажадана іх падаць для лепшага ўяўленьня, адсутнічаюць паказаньні на колькасьць спажыўных матэрый, якія ўносяцца ўраджаямі с.-г. расьлін і нормы ўгнаеньня вапнай і каліем; выказ у кілёграмах і квінталах нязручны—трэба прытрымлівацца чаго нэбудзь аднаго (стр. 36); падрабязна спыніцца на пасеве траў (стр. 39); больш дэтальна падаць разьлікі па залужэньні (стр. 41). Вельмі асьцярожны разьлікі прыбыткоўвасьці культуры балот—у жыцьці яны больш эфэктныя. Пажадана было-б адлюстраваць буйныя культурна-тэхнічныя работы ў Мар'іне, Наогул кніжкі цікавыя і карысныя.

Т. Місючэнка—«Мэліяцыйныя таварыствы і карысьць ад іх». Выд. БДВ, 1926 г., Менск, стр. 27, цана 12 кап.

Кніжка напісана добра, але, дзякуючы ўзмоцненаму тэмпу мэліяцыйнага будаўніцтва, зьяўляецца некалькі пастарэлай. Закон аб мэліяцыйных т-ваах застарэў і парадак рэгістрацыі т-ваў іншы, чым той, што апісаны ў кніжцы, і разьмеры крэдытных асыгнаваньняў на мэліярацыю значна павялічыліся—разоў у 20 супроць 1926 году. Вельмі карысная спасылка на практыку Менскай балотнай станцыі (стр. 19) і работы «Акцябрскага т-ва» ў Бабруйскай акрузе.

Мала зьвернута ўвагі на арганізацыйны бок справы мэліярацыйных т-ваў: з 27 стр. гэтаму пытаньню адводзіцца толькі 7 старонак, у той час, як гэта павінна быць асноўнай тэмай. Трэба было дэтальна разгледзець прыкладны статут мэліярацыйнага т-ва.

Торфмайстар А. Кобазаў.—«Скарыстаньне торфу ў сялянскай гаспадарцы». Выд. БДВ., г. Менск, 1929 г., стр. 95, цана 23 кап.

Праблема торфу ў справе выкарыстаньня яго ў сельскай гаспадарцы не магла быць лепш папулярызавана, чым гэта зроблена ў кніжцы т. Кобазава. Усебаковае выкарыстаньне торфу ў сялянскай гаспадарцы з асноўнымі ведамі па харчаваньні расьлін і ўласьцівасьцях торфу, ужываньне торфу на подсьціл і ўгнаеньне ва ўсялякіх відах і карысьць ад яго, пацьверджаная прыкладамі дасьледчых устаноў і сялянскадасьледчыкаў на Беларусі, пры вылажэньні простай, зразумелай мовай—вельмі пераканаўча.

Кніжка прынясе вялікую карысьць справе ўкараненьня торфу ва ўжытку сялянскае гаспадаркі Беларусі і трэба пажадаць ёй самага шырокага пашырэньня ў хатах-чытальнях школах, саўгасах, калгасах.

Мэліяратар.

Пасяджэньне Белбюро сэкцыі працаўнікоў друку

адбудзецца сёньня 8-га сьнежня, а 4-ай гадзіне дня ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» (рог вуліц Ленінскай і К. Маркса).

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Зацьвярджэньне пляну працы бюро.
2. Разгляд лісту ВСНГБ аб пэфэтве газэт над рабочымі выхадцамі.
3. Інфармацыя аб перавыбарах мясцкому газэт «Рабочы» і «Орка».
4. Разгляд заяў Ладнага, Гарэліка і інш.
5. Бягучыя справы.

Яўка ўсіх членаў Белбюро абавязкова. Запрашаюцца старшыні мясцкомаў.

Адказны сакратар Белбюро **АНІШЧУК.**

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

НЯДЗЕЛЯ, 8 сьнежня, спэктакль для швэйнай ф-кі „Кастрычнік"

Д. Бэргольсон. ГЛУХІ

Пачатак роўна а 8 гадз. увеч

Астача білетаў у касе тэатру.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Рэйкі гудуць

Звыш праграмы хроніка Белдзяржкіно

Пасьля кожнага сэансу выступленьне Е. ЛЬВОВАЙ І ДОРЫНА

Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса— ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал

Нямецкі фільм Зялёны завулак

драма ў 6 частках

Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 65

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса--ад 5 г.

КІНО Пралетарый

Новы бытавы фільм вытворчасьці „Совкино" НА ЗАВАРОЦЕ Драма ў 6 частках

Звыш праграмы амэрык. арігінальн. камэдыя ЯНА--ГЭТА ЁН у 2-х частках

Пачатак--а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.

1-ны дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

Новы фільм савецкае вытворчасьці МАНІФЭСТ гістарычна-хронікальная карціна ў 5 частках

Звыш праграмы ЦЁМНЫ КАНЁК

Амэрыканская камэдыя ў 2 частках

Каса адчынена ад 2 гадз,

КІНО СпартаК

З панядзелка 2 сьнежня звыш праграмы гастролі сатырыкаў-шутоў Е. І. Ю. Штукаровых

У рэпэртуары-юмар, сатыра злоба дня

На экране--настаўці фільм ЗАКОН ГОР драма ў 8 част

Каса--ад 5 г. Пачатак 1 с. а 6 г. 30 м.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

Чырвоная Беларусь

ЗАОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў па чатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапеечныя марки.

Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, баг. рахунак № 683. Усю карэспандэнцыю накіроўваць: Менск Усекабанк, Заочным курсам.

ЗАОЧНЫЯ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., маслян., рельефн. анилин. не расплыв. красками. Бисерн., жемчужн. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, коже и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменье рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мол. мар.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ Акцыянэрнага Т-ва „ОРГСТРОЙ" з 8-га сьнежня г. г. ПЕРАХОДЗІЦЬ У НОВАЕ ПАМЯШКАНЬНЕ на Савецкую вул., № 55, дом НК РСІ.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

EXTRACTUM TESTICULORUM

ОТДЕЛ ГАЛЕН МОСКВА в МОСКВЕ

ПРЕЙСКУРАНТ ВЫСЫЛАЕТСЯ БЕСПЛАТНО

ЦЕНА ФЛАКОНА 2 РУБЛЯ ПЕРЕСЫЛКА ЗА НАШ СЧЕТ